

БУДНІ СЕЛЬСКАГА ЎЧАСТКОВАГА 4

ЖАНОЧАМУ АРКЕСТРУ «ЛІРА» ХУТКА — 45 11



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

2 СНЕЖНЯ 2020 г. СЕРАДА № 235 (29349)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Людміла НІЖЭВІЧ, старшыня Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Палаты прадстаўнікоў:**

*«Дарожны збор, які прапануецца парламентарыямі, максімальна ўлічвае пажаданні грамадзян у частцы перыядычнасці яго выплаты, прэферэнцый для асобных катэгорый грамадзян, велічыні збору. Гэта неідэальнае рашэнне — нават сярод дэпутатаў меркаванні раздзяліліся. Але калі не ўдавацца ў дэталі, то нават тым, хто выязджае раз у месяц, або, скажам, веласіпедыстам, збор з якіх не спаганяецца, дзяржава павінна забяспечыць дарогу адпаведнай якасці і стандартаў. І прыцягненне сродкаў грамадзян у выглядзе таго ці іншага падатку, плацяжу для гэтых мэтаў — не беларускае вынаходніцтва, гэта сусветная практыка».*

# ВОСТРАЎ ДАБРЫНІ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У Мазыры ёсць сапраўдны востраў дабрыні і міласэрнасці, хоць называецца ён даволі празаічна — прытулак для бяздомных жывёл. Людзі, якія тут працуюць, выконваюць волю сваіх сэрцаў, таму занятак прыносіць радасць і задавальненне. Вядома, яны любяць жывёл і мараць пра тыя часы, калі хатнія гадаванцы больш ніколі не будуць аказвацца на вуліцы. На гэтым здымку — Ірына НЕЎМЯРЖЫЦКАЯ *(справа)* — старшыня грамадскага аб'яднання «Абарона жывёл «Верныя сябры» — і Яна НЕХАРОШАВА — супрацоўніца пункта часовага ўтрымання. Дзясяты год Ірына кіруе аб'яднаннем, пад яе пільным вокам працуе і прытулак. Яна — былы педагог-выхавальнік, тут функцыянуе чатыры гады, прыязджае на работу за трыццаць кіламетраў. На здымку і сабачка па мянушцы Бім — з цяжкім, але па-свойму шчаслівым лёсам. Рухацца Біму дапамагае інвалідны вазок. Тым, хто пра яго клапоціцца, ён, як і іншыя гадаванцы прытулку, адказвае ўдзячнасцю і безумоўнай любоўю, што патрэбныя ў гэты няпросты час кожнаму.

*Працяг тэмы* **СТАР. 13**

## КОРАТКА

- Аляксандр Лукашэнка сёння возьме ўдзел у сесіі Савета калектыўнай бяспекі АДКБ.
- **Урачыстая цырымонія ўзнагароджання пераможцаў рэспубліканскага конкурсу «Валанцёр года — 2020» адбудзецца 4 снежня ў Мінску.**
- Колькасць спажыванай электрамабілямі энергіі ў Беларусі за год павялічылася ў чатыры разы.
- **БДУ прадставіць 13 распрацовак на 20-й Міжнароднай спецыялізаванай выставы «Машынабудаванне. Металаапрацоўка. Зварка. Казань».**

ISSN 1990 - 763X

Размова па сутнасці

# ШКОЛА — ПРАСТОРА ДЛЯ ДЫЯЛОГУ

### Чаму на тэму булінгу можна і трэба выказвацца ўслых...



**Рэспубліканскі цэнтр псіхалагічнай дапамогі падрыхтаваў для педагогаў рэкамендацыі па вырашэнні канфліктных сітуацый. Пра гэта падчас круглага стала ў прэс-цэнтры БелТА паведаміла начальнік Рэспубліканскага цэнтра псіхалагічнай дапамогі БДПУ Вольга МАЦЮХОВА.** **СТАР. 7**

Перадсвяточнае

# ШАКАЛАДНЫЯ ЖАДАННІ ПА-БЕЛАРУСКУ



**Снежань заўжды становіцца самым незвычайным месяцам года, калі ўвесь свет чакае навагодняя святы. Для адных гэта час прадчування адпачынку, для іншых — надыход «гарачага» сезона, калі трэба завіхацца, каб не ўпусціць пакупніка. Самымі запатрабаванымі становяцца ёлачныя цацкі, бясконцыя падарункі (часам з таго, што пад руку ці на вока трапіць), і, вядома ж, ласункі. Каб заахвоціць пакупніка, вытворцы цукерак стараюцца рабіць не толькі смачна, але і прыгожа, а яшчэ і па-дызайнерску абыграць сімвал надыходзячага года. Карэспандэнт «Звязды» пабывала на адной з кандытарскіх фабрык краіны, каб паглядзець, што тут рыхтуюць да свята і якімі салодкімі навінкамі збіраюцца здзіўляць беларусаў.** **СТАР. 9**

Ва ўрадзе

# АЎТОБУСЫ І ДЗІЦЯЧЫЯ САДКІ ДЛЯ СУСЕДЗЯЎ

**Беларусь гатова актывізаваць свой удзел у праграмах развіцця сельскай гаспадаркі на Пскоўшчыне**

Пра гэта паведаміў намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Ігар Петрышэнка падчас пасяджэння ў фармаце відэаканферэнцыі рабочай групы па супрацоўніцтве Беларусі і Пскоўскай вобласці. Перагаворы з расійскага боку ўзначаліў губернатар рэгіёна Міхаіл Вядзернікаў.

«Пскоўская вобласць спецыялізуецца на мясной жывёлагадоўлі, вырошчванні бульбы, агародніны, кармавых культур, яна таксама адзін з галоўных ігракоў у Расіі на рынку вытворчасці свініны. У Беларусі падобная структура сельгасвытворчасці, гэта дае магчымасць арганізаваць пастаянны абмен вопытам, тэхналогіямі і спецыялістамі. Беларускі бок гатовы актывізаваць свой удзел у праграмах развіцця сельскай гаспадаркі ў Пскоўскай вобласці», — перадае словы Ігара Петрышэнкі БелТА.

Ён таксама прапанаваў пашырыць пастаўкі ў гэты рэгіён Расіі прадукцыі беларускага сельгасмашынабудавання — энерганасычаных трактароў, збожжаўборачных і кормаўборачных камбайнаў, зернесушыльных комплексаў, пасяўных і глебаапрацоўчых агрэгатаў. Акрамя прылад для АПК, айчынныя машынабудаўнікі могуць забяспечыць патрэбы Пскоўскай вобласці ў пасажырскай, грузавой, дарожнабудаўнічай і камунальнай тэхніцы.

Ігар Петрышэнка адзначыў: ён ведае, што перад Пскоўскай вобласцю стаіць пытанне кардынальнага абнаўлення парку гарадскіх аўтобусаў, перш за ўсё ў сталіцы рэгіёна.

На думку віцэ-прэм'ера, для Пскоўшчыны актуальныя паслугі беларускіх будаўнікоў у сферы ўзвядзення жылых кварталаў, сацыяльных аб'ектаў з прыцягненнем крэдытных рэсурсаў Банка развіцця Беларусі.

«У цэлым мы гатовы абмяркоўваць любыя прапановы, накіраваныя на актывізацыю двухбаковага супрацоўніцтва, забяспечыць максімальную падтрымку ўсіх узаемавыгадных канструктыўных ідэй і праектаў», — дадаў намеснік прэм'ер-міністра.

Сацыяльны вектар

# ГАЛОЎНАЕ — ВЫЦЯГНУЦЬ ЛЮДЗЕЙ З ДОМУ

**Ужо не першы год у нашай краіне ўзнімаюцца пытанні аб паўнавартасным уключэнні людзей з інваліднасцю ў грамадства. Прымаюцца законы, накіраваныя на паляпшэнне якасці жыцця, сацыяльнай інтэграцыі такіх людзей, з'яўляюцца аб'екты, дзе створана безбар'ернае асяроддзе, курсіруюць аўтобусы, прыстасаваныя для абслугоўвання людзей з праблемамі апорна-рухальнага апарату. Але ў той жа час многія праблемы так і застаюцца нявырашаныя. Ці часта вы можаце сустрэць людзей з інваліднасцю, напрыклад, у музеях, тэатрах, на святах, фестывалях? І ці ёсць у гэтых людзей магчымасць для выбару заняткаў, прафесійнай дзейнасці?**

## СВЕТ ПАЧЫНАЕЦЦА З ДАРОГІ

Як заўважыла падчас прэс-канферэнцыі, што прайшла ў Прэс-цэнтры Дома прэсы, **старшыня праўлення Мінскай абласной арганізацыі ГА «Беларускае таварыства інвалідаў» Ганна ГАРЧАКОВА,** нягледзячы на тое што мы рухаемся сямімільнымі крокамі, што створана багата добрых законаў, цудоўных алгарытмаў і тэхнік, як падтрымаць людзей з інваліднасцю, — рэальна прасунуцца ў вырашэнні шматлікіх пытанняў усё ж цяжка. Для многіх людзей, якія маюць пэўныя абмежаванні ў сувязі са станам здароўя, мары пра грунтоўныя рэчы, такія як адукацыя і працаўладкаванне, усё яшчэ недасяжныя. Атрымаць адукацыю людзям з інваліднасцю даволі складана, выбар прафесій абмежаваны. У многіх установах сёння не створаны ўмовы для навучання людзей з парушэннямі апорна-рухальнага апарату, слыху, ментальнасці, зроку. Атрымліваецца, што сёння даводзіцца працаўладкоўваць людзей без пэўнай кваліфікацыі.

Але ёсць яшчэ і транспартнае пытанне: як чалавеку з інваліднасцю дабірацца на работу? Дзяржава прыкладае шмат намаганняў для таго, каб гэтае пытанне было вырашана. Так, з'явіліся аўтобусы з нізкай падлогай, але ці заўсёды такі транспарт можа блізка падысці да прыпынку? Часам пляцоўка можа не супадаць па ўзроўні — і ў выніку забрацца ў грамадскі транспарт у інваліда не атрымліваецца. Вадзіцелям далі функцыянальны абавязак — дапамагаць людзям з інваліднасцю, але гэтая норма таксама не спрацоўвае, таму што... пра такую магчымасць асобы з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі папросту не ведаюць і таму не выходзяць з дому.

Уявім такі выпадак, калі ў чалавека з інваліднасцю ёсць аўтамабіль, але спецыяльна абсталяваных для такіх асоб паркоўкі занятыя звычайнымі грамадзянамі. Апошнія нават не задумваюцца, наколькі адабранае імі месца патрэбна іншым: справа не толькі ў тым, каб інваліды маглі б бліжэй прыпаркавацца да пэўнага аб'екта, ім патрэбна спецыяльная прастора, каб яны змаглі выбрацца з уласнага аўто.

Транспартнае забеспячэнне не менш важнае за безбар'ерныя аб'екты, пандусы, пад'ёмнікі. Менавіта для людзей з абмежаваннямі так магчымы выхад «у свет». На гэтым завязана ўсё: доступ да адукацыі, работы, культуры, спорту, мастацтва.

## НОВЫЯ ПРАПАНОВЫ

Бясспрэчна, для паляпшэння жыцця людзей з асаблівымі запытамі патрэбны ідэі. Насамрэч у беларусаў іх багата. Наш вопыт нават цікавы замежнікам. Напрыклад, Ганна Гарчакова 17 гадоў выкладае бальныя танцы, яе майстар-класамі зацікавіліся амерыканцы, бо да такога ўзроўню інклюзіі там яшчэ не дараслі.

У той жа час у нашай краіне замежны вопыт таксама актыўна вывучаецца. Напрыклад, у Гомелі створаны Цэнтр інклюзіўнай культуры, дзе людзі з абмежаваннямі здароўя могуць раскрыць свой творчы патэнцыял. Тут 23 творчыя калектывы працуюць у дзесяці кірунках. Калектыў народнага тэатра жэставай песні «Пластылін» мае шмат дыпломаў і ўзнагарод з фестываляў і конкурсаў рэспубліканскага і міжнароднага ўзроўняў. Тут можна не толькі далучацца да тэатральных і танцавальных студый, займацца мастацтвам, але і робататэхнікай, працаваць кінарэжысёрам, мантажорам. За год цэнтр арганізуе больш за 200 мерапрыемстваў, сярод якіх фестываль сатыры і гумару, жаночы інклюзіўны праект «Упэўненая», спектаклі тэатра клаунады і пантамімы. Створана каворкінпрастора «Інклюзіў- хаб», дзе грамадскія арганізацыі дзеляцца перадавымі сістэмамі інклюзіўнай адукацыі. Натуральна, у цэнтры створаны ўсе ўмовы, каб можна было без праблем дабрацца і перамяшчацца па будынку. Але аказалася, што трэба прыкласці шмат намаганняў, каб завабіць сюды людзей з інваліднасцю.

## ЯК РАСТВАРЫЦЦА Ў ГРАМАДСТВЕ?

Часам цікавых прапаноў недастаткова, каб выцягнуць людзей з замкнёнага свету ўласнай кватэры. Пасля працяглай ізаляцыі асобам з фізічнымі абмежаваннямі часам патрэбна і дапамога псіхолага, у многіх бываюць праблемы з камунікацыяй, ім неабходна вучыцца наладжваць зносіны.

У гэтым годзе беларускія архітэктары працавалі над праектам «Горад без бар'ераў» — гэта цудоўны прыклад таго, якімі могуць быць паркавыя ці жылыя зоны, адаптаваныя пад людзей з інваліднасцю.

Але гаварыць, што безбар'ерная інфраструктура сама па сабе дазволіць людзям з асаблівымі магчымасцямі растварыцца ў грамадстве, пакуль зарана. Як заўважыў **загадчык філіяла «Цэнтр інклюзіўнай культуры» ДУ «Гарадскі цэнтр культуры» горада Гомеля Кірыл КУРДЗЮМАЎ,** два гады запар падчас святкавання Дня горада ў абласным цэнтры арганізоўваецца інклюзіўны сквер, у якім выстаўляюцца вырабы як творцаў самадзейных, так і работнікаў прадпрыемстваў, дзе працуюць людзі з інваліднасцю. Для многіх гараджан — сапраўднае адкрыццё, што, аказваецца, побач з імі жывуць людзі з фізічнымі абмежаваннямі і што іх вельмі многа. Падобныя мерапрыемствы дазваляюць лішні раз заявіць аб праблемах і ў той жа час паказаць, як многа цудоўных рэчаў і праектаў могуць рабіць людзі з інваліднасцю.

## БІБЛІЯТЭКІ ЗАПРАШАЮЦЬ

Для рэалізацыі творчых індывідуальных здольнасцяў людзей з абмежаванымі магчымасцямі важны доступ да інфармацыі. Сёння Нацыянальная бібліятэка Беларусі многа працуе ў гэтым рэчышчы. Пры пабудове новага сховішча былі ўлічаны патрабаванні безбар'ернага асяроддзя. Тут ёсць пандусы, ліфты, пад'ёмнікі, закуплены крэсла-каляска і спецыяльнае абсталяванне. Ладзяцца экскурсіі, адаптаваныя пад людзей з асаблівымі патрэбамі (з псіхафізічнымі асаблівасцямі; для тых, хто мае праблемы са зрокам). І такая работа будзе весціся і надалей.

Сёння шмат увагі аддаецца рабоце па стварэнні кантэнту для людзей, якія не могуць успрымаць візуальную інфармацыю. Напрыклад, інваліды-калясачнікі з любога кутка Беларусі могуць атрымаць доступ да паўнатэкставых рэсурсаў і карыстацца імі аддалена. А людзі, у якіх адсутнічае зрок, маюць патрэбу ў іншай дапамозе. «Важна зрабіць фонды даступнымі для ўсіх без абмежаванняў», — упэўнена **загадчыца сектара абслугоўвання навуковых работнікаў аддзела бібліятэчнага абслугоўвання Нацыянальнай бібліятэкі Вольга НЕСЦЯРЭЎСКАЯ.** Установай было закуплена абсталяванне, якое пераводзіць друкаваную ці электронную інфармацыю ў гукавы фармат. На працягу сямі гадоў «Нацыяналка» займаецца электроннай дастаўкай фрагментаў адаптаваных дакументаў для асоб з інваліднасцю па зроку. Выконваюцца канкрэтныя заказы карыстальнікаў — як правіла, яны звязаныя з вучобай ці даследчыцкай дзейнасцю. Супрацоўнікам бібліятэкі неабходна іх пададзіць у такім выглядзе, каб спецыяльная праграма, усталяваная на камп'ютары, магла іх прачытаць. Запатрабаваныя і гукавыя запісы, каб інфармацыю можна было ўспрымаць на слых.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Францыя і Вялікабрытанія падпісалі дамову аб кантролі за міграцыяй цераз Ла-Манш



З 1 снежня ўступіла ў сілу новае пагадненне аб узмацненні кантролю за водамі праліва. Аб гэтым паведаміла «Міжнароднае французскае радыё». Згодна з падпісаным дакументам, колькасць французскіх патрулёў на ўзбярэжжы Ла-Манша будзе падвоена і ўзброена беспілотнікамі і радарамі. Незаконна пераадолець Ла-Манш спрабуюць бежанцы з Афрыкі і Блізкага Усходу, якія не задавальняе жыццё ў Францыі. Вялікабрытанія адмаўляецца прымаць мігрантаў, якія пераплываюць праліў на лодках. Лондан патрабуе ад Францыі стрымліваць нелегалаў на сваёй тэрыторыі. Міністр унутраных спраў Вялікабрытаніі Прыці Патэль вітала заключэнне пагаднення, заявіўшы, што яно дазволіць дзвюм краінам «падзяліць місію па прадухіленні перасячэння праліва Ла-Манш».

## У Турцыі ўвялі каменданцкую гадзіну



Прэзідэнт Турцыі Рэджэп Таіп Эрдаган абвясціў аб увядзенні штодзённай каменданцкай гадзіны ў краіне. Пра гэта паведаміла РІА «Навіны». Кіраўнік дзяржавы расказаў, што будзе абмежаваны рух жыхароў у рабочыя дні з 21.00 да 05.00. У выхадныя выходзіць на вуліцу будзе цалкам забаронена. Эрдаган таксама дадаў, што з 1 снежня спынілі работу лазні, саўны, басейны і спартзалы. Акрамя гэтага абмежавана колькасць наведвальнікаў гандлёвых цэнтраў, якіх будуць пускаць унутр толькі па лічбавым кодзе. Раней Міністэрства аховы здароўя Турцыі ўвяло новыя абмежаванні для адпачывальнікаў у гатэлях у сувязі з ростам колькасці заражэнняў каранавірусам. Напрыклад, ад рэстаранаў, якія працуюць на тэрыторыі гасцініц, запатрабавалі абслугоўваць выключна пастаяльцаў гатэля. Акрамя таго, ім нельга выдаваць ежу навынас. Гасцініцам забаранілі праводзіць забаўляльныя мерапрыемствы пасля 10-й вечара, уключаючы жывую музыку ў рэстаранах і канцэртных памяшканнях.

## На Сонцы адбыўся магутны выбух



Ён стаў наймацнейшай успышкай за апошнія тры гады. Выбуху прысвоены чацвёрты бал па пяцібальнай шкале. Аб гэтым паведаміла лабараторыя рэнтгенаўскай астраноміі ФІАН. Выбух адбыўся на тым баку Сонца, які нябачны з Зямлі, таму існуе верагоднасць, што яго магутнасць была значна большая, чым гэта вынікае з паказанняў касмічных дэтэктараў рэнтгенаўскага выпраменьвання. Пацярпелая вобласць была настолькі вялікая, што верхнюю частку ўспышкі стала відаць з-за левага краю сонечнага дыска. Навукоўцы не выключаюць, што насамрэч падзея адносіцца да найвышэйшага X класа. Па словах астраномаў, выбух не акажа ўплыву на Зямлю, паколькі зараджаныя часціцы іпаткі плазмы пройдуць за сотні мільёнаў кіламетраў ад нашай планеты.

# 475 МЕДЫКАЎ АТРЫМАЮЦЬ УЗНАГАРОДЫ БЕЛАРУСКАГА ФОНДУ МІРУ

**Рэспубліканскую дабрачынную акцыю «Паклон вам нізкі, нашы дактары» праводзіць Беларускі фонд міру ў рамках праграмы «Клопат і міласэрнасць». Гэта працяг той дапамогі, якую ўжо аказала арганізацыя ўстановам аховы здароўя, што лечаць пацыентаў з COVID-19.**



Фота БелТА.

У пачатку гэтага года, падчас першай хвалі каранавіруснай інфекцыі, Беларускі фонд міру дапамог медустановам на суму больш за 120 тысяч рублёў. Мэтай цяперашняй акцыі з'яўляецца маральная і матэрыяльная падтрымка медыкаў, якія непасрэдна займаюцца лячэннем і доглядам пацыентаў з COVID-19.

Прадстаўнікі Беларускага фонду міру наведаюць 176 устаноў аховы здароўя, у тым ліку 18 сталічных, 16 — на Брэстчыне, 37 — на Віцебшчыне, 40 — на Магілёўшчыне, 23 — на Гродзеншчыне, па 21 — у Гомельскай і Мінскай абласцях.

Узнагароды Беларускага фонду міру, а гэта падзякі, ганаровыя граматы, медалі «Заслужаны міратворац», атрымаюць па прадстаўленні галоўных урачоў медыкі гарадскіх, раённых, абласных, рэспубліканскіх медустаноў, на базе якіх функцыянуюць ці дзейнічалі раней аддзяленні для пацыентаў з каранавіруснай інфекцыяй. Усяго будзе адзначана 475 медыцынскіх работнікаў. На думку арганізатараў акцыі, гэтыя ўзнагароды не толькі прыцягнуць грамадскую ўвагу да медыцынскай супольнасці і выявяць падзяку, але і дапамогуць прыцягнуць і актывізаваць збор добраахвотных ахвяраванняў для мэтавай дапамогі медустановам.

**Алена КРАВЕЦ.**

Ведай нашых!

## НЕСЦІ СВЯТЛО І ДАБРЫНЮ

**Народны тэатр Магілёўскага абласнога палаца творчасці атрымаў Гран-пры міжнароднага анлайн-конкурсу #ДетиСветаВеVictory (Масква).**

Высокай узнагародай адзначаны спектакль-гульня для дзяцей па п'есе расійскага драматурга Рагіма Мусаева «Мяў, гаў і чык-чырык», паведамляе сайт гэтай установы культуры. Рэжысёр-пастаноўшчык спектакля — кіраўнік тэатра Аліка Кускова. Музыку да пастаноўкі напісаў аранжыроўшчык Аляксандр Нурыханаў.

— Спектакль падкупіў сваімі рознаўзроставымі і рознаўзроўневымі артыстамі, якія дзейнічаюць сумесна з адной мэтай: несці дзецям святло і дабрыню. Гэта праўдзіва «народны» тэатр і «народны» спектакль, зроблены з любоўю для дзяцей і нават іх бацькоў, — напісала ў сваіх каментарыях эксперт фестывалю, член журы ў намінацыі «Тэатр», актрыса, прадзюсар Аляксандра Краўчанка.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

## Юрысты папрацуюць бясплатна ў свае свята

**Спецыялісты ўсіх натарыяльных бюро і натарыяльных кантор Беларусі 4 снежня правядуць дабрачынную акцыю па бясплатным кансультаванні беларусаў і гасцей краіны, якая традыцыйна прымеркавана да Дня юрыста.**

На працягу згаданага дня ў рэжыме анлайн можна будзе атрымаць адказы на пытанні, якія знаходзяцца ў кампетэнцыі натарыусаў, накшталт афармлення спадчынных правоў, складання завяшчання, шлюбнага дагавора, адчужэння нерухомасці, здзяйснення выканаўчых надпісаў і іншага.

Каб мінімізаваць асабістыя кантакты і абараніцца ад магчымай рызыкі захворвання на каранавірус, натарыусы будуць кансультаваць па тэлефонах ці праз відэасувязь у месенджарах. Фармат адносін можна вызначыць загадзя, патэлефанаваўшы ў натарыяльную кантору ці натарыяльнае бюро. Поўны спіс гэтых устаноў і іх кантакты можна знайсці на сайце Беларускай натарыяльнай палаты belnotary.by ў раздзеле «Знайсці натарыуса».

**Ірына СІДАРОК.**

Вярнуць пазіцыі

## ПАТЭНЦЫЯЛ «ТРАФЕЙНАГА» ТУРЫЗМУ

### Сёлета ён пераведзены ў анлайн-фармат

**У краіне растуць папуляцыі паляўнічых відаў жывёл. Колькасць лася дасягнула звыш 40 тысяч асобін, аленя — каля 30 тысяч, казулі — больш за 100 тысяч. Такім чынам, павялічваецца і іх здабыча. Аб гэтым расказаў начальнік аддзела паляўнічай гаспадаркі Міністэрства лясной гаспадаркі Аляксандр КАЗАРЭЗ.**

— У сувязі з гэтым мы чакаем павелічэння колькасці турыстаў пасля паляпшэння сітуацыі з каранавірусам. Патэнцыял паляўнічага турызму дастаткова высокі. Працягваецца летне-асенні сезон палявання на птушыную дзічыну, ужо адкрыўся асенне-зімовы на пушных жывёл, а таксама на капытных. Сёлета колькасць паляўнічых узрасла: калі штогод імі становілася 1,1—1,2 тысячы чалавек, то ў гэтым годзе іх колькасць склала ўжо 1,6 тысячы. У першую чаргу гэта звязана з закрыццём меж, многім складана кудысьці выехаць, і яны звяртаюць увагу на ўнутраны патэнцыял. Цяпер у нас вельмі актыўна развіваецца інфармацыйная сістэма, якая дае паляўнічым права куплі пуцёвак на паляванне ў анлайн-фармаце. Калі на 1 студзеня бягучага года ў ёй было зарэгістравана прыкладна 2,5 тысячы чалавек, то на сёння іх больш за 3,4 тысячы. Праз яе сёлета мы рэалізавалі больш за 2,3 тысячы пуцёвак. Часцей за ўсё паляўнічыя набываюць іх менавіта на пушных жывёл. Зараз мы займаемся дапрацоўкай гэтай сістэмы з французскім інстытутам пералётных птушак. У верасні Прэзідэнтам быў прыняты Указ № 345, згодна з якім павялічаны тэрмін дзеяння дазволу на нашэнне і захоўванне паляўнічай зброі з трох да пяці гадоў і тэрмін дзеяння медыцынскай даведкі, на падставе якой падаўжаецца або атрымліваецца такі дазвол. Гэта вырашыла праблемнае для многіх пытанне.

Уязны турызм у краіне летась стаў рэкордным: было праведзена каля тысячы паляўнічых тураў, у якіх прыняло ўдзел звыш 2,2 тысячы замежнікаў, а выручка склала больш за мільён еўра. Аб гэтым расказаў **намеснік начальніка ўпраўлення палявання, рыбалоўства і турызму Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў Уладзімір КАЗЛОЎСКІ.**

— Часцей за ўсё да нас прыязджаюць з Расіі (каля 85 працэнтаў ад агульнай колькасці), а таксама з Германіі, Польшчы, Галандыі, Аўстрыі. Здабываюць замежнікі практычна ўсіх паляўнічых жывёл. У асноўным такіх паляўнічых прыцягвае вельмі якасная арганізацыя працэсу, ды і шчыльнасць жывёл у нас вышэй, а значыць, можна здабыць трафей нашмат хутчэй. У бягучым годзе з-за пандэміі сітуацыя з уязным турызмам пагоршылася, шэраг тураў прыйшлося перанесці на наступны год ці адмяніць. Аднак патэнцыял у развіцці ёсць. Таксама некалькі апошніх гадоў мы займаемся зарыбленнем вадаёмаў. З 2015 года ў краіне іх было зарыблена 90 — засялілі каля 200 тон рыбапасадачнага матэрыялу, а гэта прыкладна каля 700 тысяч рыб. Такую дзейнасць плануем працягваць.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

## НОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ

### Экалагічныя праблемы нельга «паставіць на паўзу»

**Белінвестбанк выпусціў банкаўскую картку, якая дапамажа развіваць экарух у Беларусі. Усе, хто будуць ёй карыстацца, змогуць аўтаматычна падтрымліваць адну з некамерцыйных экалагічных арганізацый — Цэнтр экалагічных рашэнняў (ecoidea.by).**

Механізм дабрачынных узносаў просты: паўпрацэнта з кожнай пакупкі па картцы пералічваюцца на рахунак арганізацыі. Усе, хто набываюць «ЭкаЛагічную карту», становяцца таксама і прыхільнікамі Цэнтра экалагічных рашэнняў, атрымліваюць доступ да ўсіх спецыяльных бонусаў: эксклюзіўных мерапрыемстваў, зніжак на тавары і паслугі ў экалагічна дружалюбных крамах.

— Гэта выдатны прыклад супрацоўніцтва бізнесу і некамерцыйных арганізацый у вырашэнні грамадска значных праблем, — пракаментаваў падзею **дырэктар Цэнтра экалагічных рашэнняў Яўген ЛАБАНАЎ.** — Для нас асабліва важна развіваць падтрымку арганізацыі ўнутры краіны, і запуск такой карты стаў важным крокам на гэтым шляху. Мы разумеем, што ў гэты няпросты для нашай краіны час пытанні аховы навакольнага асяроддзя не з'яўляюцца першачарговымі для большасці людзей. Разам з тым, рашэнне экалагічных праблем складана паставіць на паўзу, таму мы будзем вельмі ўдзячныя людзям, якія працягнуць падтрымліваць нас рознымі спосабамі, наўпрост на сайце або з дапамогай новай «ЭкаЛагічнай карты».

Таксама ўладальнікі «ЭкаЛагічнай карты» змогуць самастойна пералічваць сумы ахвяраванняў Цэнтру экалагічных рашэнняў, выбіраючы перыядычнасць: разава ці ўвесь час. За плацяжы звыш 30 рублёў (15 еўра па валютнай карце) у месяц банк верне на картку два працэнты ад сумы ахвяравання ў якасці кэшбэка. Зрабіць гэта можна праз сістэму АРІП у мабільнай праграме або з дапамогай інтэрнэт-банкінгу Белінвестбанка, а таксама ў банкаматах і інфакіёсках банка.

Аформіць «ЭкаЛагічную карту» можна ў любым аддзяленні Белінвестбанка.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Крымінал, здарэнні

## НЕ ЗАДЭКЛАРАВАЎ КАВУ І ВІТАМІНЫ

### І на ўсялякі выпадак схаваў тавар

**Камерцыйную партыю кавы і вітамінаў спрабаваў незаконна перамясціць праз беларуска-польскую мяжу кіроўца вялікагруза, які рухаўся з таварам «шакаладныя цукеркі» на адрас расійскага атрымальніка. Парушэнне выяўлена гродзенскімі мытнікамі ў пункце пропуску «Бераставіца».**

Мінчанін, які ажыццяўляе грузавыя перавозкі ў якасці кіроўцы, заявіў, што не перамяшчае тавары, якія падлягаюць дэклараванню. Аднак пры мытным аглядзе транспартнага сродку ў кабіне кіроўцы, а таксама ў тэхналагічнай нішы паўпрычэпа выяўлена больш за 70 пачкаў кавы і каля 50 упаковак вітамінаў. Кіроўца нібыта не ведаў, што дадзены тавар неабходна дэклараваць, але разам з тым на ўсялякі выпадак схаваў яго, каб перамясціць праз мяжу, паведамляе Гродзенская рэгіянальная мытня.

Кіроўца прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці ў выглядзе штрафу.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## СПРАБАВАЎ ЗДАЦЬ НА МЕТАЛАЛОМ... АВІЯБОМБУ

**У дзяжурную часць Пінскага РАУС паступіла паведамленне аб знойдзеным боепрыпасе.**

Па інфармацыі УУС Брэсцкага аблвыканкама, мужчына, гуляючы на пустцы недалёка ад вёскі Жабчыцы, убачыў, што з зямлі відаць кавалак металу. Вясковец выцягнуў знаходку і вырашыў здаць яе на металалом. Аднак у гэты момант на падазроны аб'ект у руках жыхара вёскі звярнулі ўвагу суседзі, якія запатрабавалі неадкладна пакласці на зямлю прадмет, падобны на боепрыпас, і патэлефанавалі ў міліцыю.



На месца выехалі супрацоўнікі раённага аддзела міліцыі, якія аператыўна перакрылі тэрыторыю для бяспекі грамадзян.

Вайскоўцы сапёрна-піратэхнічнай групы в/ч 7404 ідэнтыфікавалі знаходку як 50-кілаграмовую нямецкую авіяцыйную бомбу, якая выкарыстоўвалася падчас Вялікай Айчыннай вайны, як мяркуецца, для знішчэння аэрадрома, што дзейнічаў на гэтай тэрыторыі.

Авіябомба SD-50 аснашчана адмысловым тыпам узрывальнікаў, таму любое неасцярожнае ўздзеянне на боепрыпас магло прывесці да дэтанацыі. Спецыялісты, пагрузіўшы выбухованебяспечны аб'ект у спецыяльна абсталяваны аўтамабіль, вывезлі бомбу на палігон, дзе яна была паспяхова абясшкоджана.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
**Фота з сайта УУС Брэсцкага аблвыканкама.**

Профі

Добрыя справы

## Прыйсці на дапамогу

**Некалькі дзён запар у вёсцы Паметнікі Полацкага раёна назіралася дзіўная сітуацыя ў адным з дамоў. Там жыве 92-гадовая бабуля, якую некалькі дзён не сустракалі аднавяскоўцы. Але ў хаце ўвесь час гарэла святло і бесперапынна працаваў тэлевізар. Трывогу ўзняў старшыня Ветрынскага сельскага савета Аляксей Лупач. Пры ўдзеле супрацоўнікаў Полацкага РАУС былі ўскрыты дзверы хаты.**

Аказалася, што жанчына ляжала на падлозе ў адным з пакояў. Яна растлумачыла, што ішла па лекі ў буфет, але адчула слабасць і ўпала. Колькі часу яна так правяла, сказаць не змагла.

Бабулю шпіталізавалі. Вядома, што яе стан нармалізуецца.

— Аддзел унутраных спраў Полацкага райвыканкама выказвае падзяку за свядомасць і неабыякавасць, заклікае быць уважлівымі да сваіх пажылых суседзяў, бо менавіта яны часта могуць мець патрэбу ў дапамозе і нашай спагадзе, — адзначылі ў прэс-службе МУС.

## Вандроўка з хэпі-эндам

**23 лістапада супрацоўнікі АДАІ Жлобінскага РАУС неслі службу на аўтадарозе Р149 «Жлобін—Светлагорск». Там яны вялі ўзмоцнены кантроль за тым, як удзельнікі дарожнага руху выконваюць правілы.**

Увечары міліцыянеры заўважылі, як паблізу з праезнай часткай ідзе пешаход, які не быў пазначаны святлоадбівальнымі элементамі. Аказалася, што гэта 73-гадовы жыхар Жлобіна. Ён прыехаў у вёску Малевіцкая Рудня на сваё лецішча. Паколькі надвор'е ў той дзень было спрыяльнае, дзядуля адправіўся ў лес па грыбы. Але заблукаў там і цэлы дзень спрабаваў выбрацца з лесу. Прыкладна за пятнаццаць хвілін да таго, як яго ўбачылі інспектары, ён выйшаў да дарогі.

Міліцыянеры даставілі пешахода на службовым аўтамабілі да месца пражывання і ў адказ пачулі ад яго шчырыя словы падзякі.

## Не спі за рулём

**Увечары 24 лістапада нарад ДАІ ехаў з боку Рэчыцы па дарозе М10 у напрамку Гомеля. У патрульным аўтамабілі былі два чалавекі — адказны па УДАІ УУС Гомельскага аблвыканкама падпалкоўнік міліцыі Андрэй Кацянкоў і намеснік начальніка ўпраўлення ДАІ Сяргей Юшчанка.**

У адзін момант міліцыянеры звярнулі ўвагу на дзіўны аўтамабіль. Ён ехаў у спадарожным напрамку, але пры гэтым увесь час «скакаў» з аднай паласы ў іншую. Відавочна, узнікала пагроза для іншых удзельнікаў дарожнага руху. Супрацоўнікі міліцыі вырашылі спыніць аўтамабіль, каб праверыць фізічны стан кіроўцы.

Яны ўключылі праблісковыя маячкі і гукавую прыладу, але кіроўца аўтамабіля сігналы праігнараваў і працягнуў ехаць далей. Але праз некаторы час машына ўсё-ткі спынілася.

Аказалася, што вадзіцель заснуў падчас руху. Зрэшты, працягваць ехаць далей ён таксама не мог — адчуваў сябе кіроўца далёка не самым лепшым чынам. За руль сеў Сяргей Юшчанка. Ён і прывёў аўтамабіль разам з кіроўцам, які змяніў амплуа на пасажыра, у Гомель да месца стаянкі. Тым самым удалося пазбегнуць ДТЗ з непрадказальнымі наступствамі.

# «СОЛЬ ЖЫЦЦЯ» СЕЛЬСКАГА ЎЧАСТКОВАГА

**Гэтая прафесія заўжды мела арэол рамантычнасці. Такі вобраз шмат у чым стварыўся дзякуючы старым фільмам пра міліцыянера Аніскіна, які жыў і працаваў у вёсцы. Насамрэч рамантыкі ў гэтай прафесіі не так і шмат. Яе «заглушаюць» паўсядзённыя праблемы, якія існуюць толькі ў вясковым асяроддзі.**

**Старшы ўчастковы Капыльскага РАУС падпалкоўнік міліцыі Андрэй ТРУБЛОЎСКІ** вось ужо 17 гадоў ахоўвае парадак не толькі ў сваёй роднай вёсцы Быстрыцы, але і ў іншых чатырнаццаці населеных пунктах раёна.

— Пасля таго як скончыў школу, паступіў у Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт, — згадвае Андрэй Трублоўскі. — Адвучыўся там паўтара года. Мог стаць настаўнікам матэматыкі і інфарматыкі, але ў рэшце рэшт зразумеў, што гэта не маё. З універсітэта адлічыўся, пайшоў служыць ва Узброеных Сілы. І трапіў я ва ўнутраныя войскі. А дакладней кажучы, у першую роту спецыяльнага прызначэння. Базіравалася яна дваццаць гадоў таму на вуліцы Маякоўскага ў Мінску.

Андрэй Трублоўскі служыў там паўтара года. Сумаваць не даводзілася — камандаванне перыядычна адпраўляла вайскоўцаў на дапамогу супрацоўнікам міліцыі ў абласных падраздзяленнях МУС. Падчас рэйдаў, якімі перамяжоўваліся тактычныя вучэнні, салдаты дапамагалі знаходзіць агнястрэльную зброю, што незаконна захоўвалася, патрулявалі горад... Але тэрмін службы падыходзіў да канца. І трэба было вызначацца з будучым прафесійным шляхам пасля звальнення ў запас.

— Мне тады прапанавалі два варыянты: або застацца тут на кантракт, або перайсці працаваць у органы ўнутраных спраў. Пасля разваг аддаў дакументы ў каледж міліцыі, які месціўся ў Баранавічах. Наш курс быў апошні, які выпусціўся з гэтага каледжа, — яго расфарміравалі ў 2003 годзе. І вось з таго часу і працую бесперапынна ў Блеўчыцкім сельскім савеце Капыльскага раёна, дзе і знаходзіцца мая вёска Быстрыца. Дарэчы, на сваім будучым месцы службы праходзіў усе практыкі. А калі размеркаваўся, то за мной на першы час замацавалі дасведчанага спецыяліста.

Асаблівасць працы ўчастковага на вёсцы ў тым, што насельніцтва ў параўнанні з горадам значна менш, а вось тэрыторыя абслугоўвання куды большая. Па дэмаграфіі вёска таксама адрозніваецца ад горада большай колькасцю пенсіянераў. А людзі лепш ведаюць адзін аднаго ды і жывуць іншымі задачамі. Датычыцца гэта і злачынцаў...

— Неяк нам са Стаўбцоўскага раёна паступіла паведамленне пра тое, што на старога быў здзейснены разбойны напад. Двое невядомых уварваліся ў дом і спрабавалі завалодаць грашыма дзядулі.



Ён аддаў усё, што было ў яго, — невялікую суму памерам прыкладна ў 300 рублёў. І ўжо сыходзячы з дома, адзін са зламыснікаў ударыў яго нажом у жывот. Пацярпелы праз некалькі дзён памёр у бальніцы... Тады аднаго з нападнікаў калегі са Стоўбцаў затрымалі па гарачых слядах, а другі быў абвешчаны ў вышук. І па арыенціроўцы знойдзены ў нас. Аднойчы ўдалося раскрыць цяжкае злачынства дзякуючы таму, што калісьці заўважыў у чалавека асаблівую прыкмету, якая ўрэзалася ў памяць. Ці вось чатыры гады таму было раскрыта злачынства непасрэдна на абслугоўваемай тэрыторыі. У пераднавагоднюю ноч зламыснік прыйшоў у краму і пад пагрозай нажа спрабаваў завалодаць грашыма з касы. Прадавец здолела выбегчы з крамы і патэлефанавала ў міліцыю. Магазін знаходзіўся за некалькі кіламетраў ад вёскі, дзе я жыву. Таму і ўдалося хутка затрымаць нападніка.

Але асноўная маса злачынстваў на вёсцы звязана з трывіяльнымі крадзяжамі.

— Не сакрэт, што ў глыбінцы хапае дамоў, якія ўвогуле пустуюць ці куды раз на тыдзень з горада прыязджаюць дачнікі. Яны пакідаюць там розную маёмасць — ад сельскагаспадарчага інвентара да прадуктаў харчавання. Злодзеі ведаюць, што гэты дом нежылы, ускрываюць там замкі або б'юць шыбу і лезуць па здабытак. А пасля дачнік прыязджае ўвесну, а ў доме нічога і не засталося...

Часам сельскаму ўчастковаму даводзіцца выступаць у ролі міратворца. Здараецца так, што адносіны паміж суседзямі ў вёсцы пачынаюць нагадваць апісаную Гогалем гісторыю пра тое, як пасварыліся Іван Іванавіч і Іван Нічыпаравіч.

— Бывае ж так, што людзі прыязна ставяцца адно да аднаго, пражылі побач шмат гадоў, часта нават не адзін дзясятак, а пасля... становяцца ледзь не смяротнымі ворагамі. І прычына можа быць розная — непадзелены кавалак зямлі, куры там зайшлі ў чужы агарод, адзін чалавек не вярнуў другому своечасова пазычаныя грошы. І пачынаецца ўзаемнае псаванне нерваў, бясконцыя скаргі. Асабліва прыкра, калі на сцежку вайны становяцца найлепшыя сябры. І калі пачынаеш разбірацца, з-за чаго ж пачаўся канфлікт, падставы цалкам могуць быць зусім дробныя. Часам суседзяў удаецца прымірыць паміж сабой.

— Я ім тлумачу, што праблема насамрэч выедзенага яйка не варта і ліквідуецца вельмі лёгка. А ў вёсцы ўсё ж такі трэба жыць дружна. Вось здарыцца нейкая складаная сітуацыя ў малонаселенай вёсачцы, і каго тады клікаць на дапамогу? Але калі варагаванне даўняе, то задача становіцца ўжо іншай — «развесці па розных кутах» праціўнікаў, каб не дапусціць больш цяжкіх наступстваў, звязаных з псаваннем маёмасці ці ўвогуле пагрозай здароўю. Згадваецца выпадак, калі адзін жыхар пазычыў свайму суседу некаторую суму грошай, але доўг своечасова не атрымаў назад. У выніку крэдытор пачаў рабіць дробныя паскудствы з аўтамабілем свайго даўжніка. На тым і быў злоўлены.

Участковы міліцыянер для жыхароў сяла, асабліва паважнага веку, з'яўляецца такім своеасаблівым «акном у вялікі свет». Пры гэтым такі своеасаблівы «аванс» па рэпутацыі варта спраўджваць.

— Фактычна я не праводжу рэзкіх граняў паміж рабочым і выхадным днём. Калі чалавек набраў нумар міліцыянера, значыць, у яго нешта здарылася. Але гэта датычыцца іншых аспектаў жыцця. Яны больш звязаны з асабістымі пытаннямі. І чалавек на тым канцы провада чакае парады, якая яму дапаможа. А пытанні могуць быць абсалютна розныя — ад паведамлення пра тое, што дзесьці ўбачылі бадзяжных жывёл да таго, якія дакументы трэба афарміць для разводу ці як правільна пагасіць запазычанасць або аплаціць нейкі рахунак. Адным словам, дапамагчы, калі суразмоўнік не ведае, што яму рабіць ці куды звярнуцца. Насамрэч большасць такіх пытанняў можна спакойна вырашыць наўпрост на месцы.

Прафесійныя здабыткі Андрэя Трублоўскага не прайшлі незаўважанымі на конкурсах майстэрства. Аднойчы выйграў гэтыя спаборніцтвы на рэспубліканскім этапе. Дзесяць разоў станавіўся прызёрам і пераможцам абласных аглядаў-конкурсаў, прычым аднойчы дамогся першага месца на ўзроўні краіны.

Пры ўсім гэтым у Андрэя Трублоўскага застаецца і вольны час. А захапленняў у афіцэра шмат. Ён любіць плаваць, займаецца службовым мнагабор'ем. Неаднаразова выступаў на чэмпіянаце Міністэрства ўнутраных спраў. Яшчэ адно захапленне — валейбол. Ёсць у нашага героя хобі. На прысядзібным участку ён вырошчвае вінаград, у тым ліку і экзатычныя для Беларусі сарты. Здавалася б, што клімат у нас зусім не падыдзе́вы, але ж ягада прыжылася...

— Я думаю, што праз пасаду ўчастковага інспектара павінны прайсці ўсе пачаткоўцы. Гэта дазволіць загартавацца і на сабе адчуць, так бы мовіць, «соль жыцця».

Матэрыялы падрыхтаваў Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Тэма

# ЗБЕРАГЧЫ ДЗЯЦІНСТВА,

## або Як сёння змагаюцца з педафіліяй



**За апошнія гады ў Беларусі больш чым у 20 разоў узрасла колькасць злачынстваў супраць палавой недатыкальнасці дзяцей. Узрост тых, хто церпіць ад дзеянняў педафілаў, вар'іруецца ад трох да чатырнаццаці гадоў. У 30 % выпадкаў ахвяры сексуальнага гвалту — хлопчыкі.**

**Як сёння арганізавана работа па барацьбе з педафіліяй, што трэба ведаць бацькам, каб прадухіліць бяду і ці можна распазнаць злачынца на вуліцы? На актуальныя пытанні адказаў намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі крымінальнай міліцыі МУС Дзмітрый ЦАЮН.**

***— Летась у краіне ад дзеянняў педафілаў пацярпелі 487 дзяцей. Як складваецца сітуацыя сёння?***

— За дзесяць месяцаў бягучага года супрацоўнікі міліцыі выявілі больш за 600 злачынстваў супраць палавой недатыкальнасці або палавой свабоды непаўналетніх. З іх каля 350 адносяцца да катэгорыі цяжкіх і асабліва цяжкіх. Мы ўстанавілі больш за 400 дзяцей, якія пацярпелі ад дзеянняў педафілаў, 160 з якіх — малалетнія (да 14 гадоў).

Тэндэнцыя мінулага і гэтага гадоў гаворыць аб тым, што пік пройдзены. Асноўных серыйных сеткавых педафілаў адлавілі дзякуючы новай сістэме работы. З 2013 года падраздзяленні па супрацьдзеянні гандлю людзьмі МУС займаюцца прафілактыкай, выяўленнем і спыненнем злачынстваў сексуальнага характару ў дачыненні да дзяцей. Можна сказаць, працуем на апераджэнне. Раней справа распачыналася выключна пасля паступлення заявы. А як паказвае практыка, пацярпелыя і іх бацькі не вельмі імкнуцца афішаваць праблему.

Мы падрыхтавалі алгарытм дзеянняў з установамі аховы здароўя, адукацыі. Паказалі, расказалі, на што трэба звяртаць увагу, каб прадухіліць трагедыю. Сталі далучаць сацыяльна-педагагічныя цэнтры, дзе на той момант ужо пачалі адкрывацца пакоі, дружалюбныя дзецям.

***— Ці можна скласці ўмоўны партрэт педафіла?***

— Універсальных прыкмет педафіла няма. Гэта можа быць ваш сусед па лесвічнай пляцоўцы, прадавец у краме каля дома, кіроўца аўтобуса. Распазнаць злачынцу на вуліцы амаль немагчыма. Але скласці суб'ектыўны партрэт, грунтуючыся на рабочы досвед, можна паспрабаваць. Часцей за ўсё гэта мужчына ва ўзросце ад 20 да 50 гадоў, не жанаты, без дзяцей, умее працаваць з камп'ютарам. Але ёсць выпадкі затрымання педафілаў і старэйшага ўзросту. Педафіл у адносінах з дзецьмі вельмі добры, клапатлівы. Ён пастаянна хваліць малых, заслугоўвае іх давер, хоча стаць «сваім».

Так, у сярэдзіне кастрычніка ў Мінску мы затрымалі 70-гадовага педафіла. У міліцыю звярнуўся бацька хлопчыкаў. Ён скардзіўся, што да яго сыноў на дзіцячай пляцоўцы чапляўся пажылы мужчына. Інфармацыя пацвердзілася. З чэрвеня да верасня пенсіянер выбіраў момант, калі малыя заставаліся адны, прапаноўваў ім пракаціцца на роварах або дапамагчы зрабіць самаробны лук. Пасля згоды ён адводзіў малалетніх у кусты, дзе здзяйсняў дзеянні сексуальнага характару. Ахвярамі педафіла сталі не менш за пяць хлопчыкаў. Самаму старэйшаму з іх 10 гадоў, малодшаму — пяць.

Яшчэ адно падобнае злачынства зафіксавана ў пачатку лістапада ў Гродне. 26-гадовы хлопец знаёміўся з малымі на вуліцы недалёка ад свайго дома. Старанна адсочваў і аналізаваў іх перамяшчэнне, каб не сустрэцца з бацькамі. Прапаноўваючы цукеркі і шакалад, зазываў непаўналетніх да сябе ў кватэру. Вядома аб некалькіх сексуальных кантактах як мінімум з адным дзіцем.

***— Педафілія анлайн і афлайн. Як відазмяняліся злачынная дзейнасць з цягам часу?***

— Пераважная большасць злачынстваў супраць палавой недатыкальнасці дзяцей перацякла ў інтэрнэт. Першаснае знаёмства з непаўналетнімі адбываецца менавіта там. Педафілы знаходзяць ахвяр у сацсетках, рэгіструюць фэйкавую старонку і вядуць дыялог ад асобы непаўналетняга. Пад маскай аднагодкі наладзіць кантакт значна прасцей. Педафіл угаворвае дзіця распрануцца перад вэб-камерай, дасланць «ню»-здымкі. Наступны этап — шантаж. Або інтымная сувязь, або эратычныя фота ўбачаць бацькі і сябры. Непаўналетніх заганяюць у кут, не пакідаюць ім выбару. Часцей за ўсё дзіця не можа справіцца з гэтым ціскам, паддаецца.

Такія дзеянні называюцца грумінгам. Існуе некалькі яго відаў: секс-чатынг (зносіны на сексуальныя тэмы ў інтэрнэце), секс-торшынг (шантаж дзяцей пасля атрымання педафілам інтымных фота), секстынг (абмен асабістымі інтымнымі паведамленнямі і фотаздымкамі).



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Перапіска на сексуальныя тэмы, а таксама парназдымка непаўналетніх з'яўляюцца найбольш распаўсюджанымі злачынствамі ў адносінах да дзяцей. Больш за 100 краін свету крыміналізавалі падобныя дзеянні, у Беларусі пакуль няма адказнасці за грумінг. Мы вымушаны рэагаваць толькі пры наяўнасці факту прамога сексуальнага кантакту дарослага з непаўналетнім.

У жніўні ў Магілёве затрымалі 24-гадовага педафіла, які хаваўся ў сацсетках пад жаночым нікам. Малады чалавек больш за два гады актыўна перапісваўся з дзяўчынкамі 11–12 гадоў. Прапаноўваў ім падзарабіць. За дзеянні сексуальнага характару абяцаў 15 беларускіх рублёў. «Бізнес-запрашэнне» атрымалі больш за 60 суразмоўніц.

Злачынец працаваў інжынерам на адным са сталічных прадпрыемстваў, раней да крымінальнай адказнасці не прыцягваўся. Вядома, што ў Мінску мужчына здзейсніў сексуальныя дзеянні ў дачыненні да малалетняй. Падчас затрымання ў яго канфіскавалі камп'ютарную тэхніку і мабільны тэлефон з матэрыяламі парнаграфічнага характару.

***— Якое пакаранне прадугледжана за злачынствы супраць палавой недатыкальнасці дзяцей у нашай краіне?***

— Гэта артыкулы 166—170 раздзела 20 (злачынствы супраць палавой недатыкальнасці або палавой свабоды) Крымінальнага кодэкса Беларусі.

Да 15 гадоў пазбаўлення волі прадугледжана за самае цяжкае злачынства (гвалтоўныя дзеянні сексуальнага характару з асабліва кваліфікаванымі прыкметамі). У нашай практыцы ёсць выпадак, калі дзвюх жанчын і мужчыну асудзілі да 20 гадоў. Гэта адна з самых гучных спраў мінулага года. Жанчыны прадавалі 3-гадовых дочак свайму даросламу сябру за 100 долараў за ноч. Выйсці на след злачынцаў удалося дзякуючы цеснаму міжнароднаму супрацоўніцтву.

Мінімальнае пакаранне — абмежаванне свабоды. За дзеянні, якія не ўяўляюць вялікай грамадскай небяспекі. Крымінальная адказнасць за злачынствы, якія класіфікуюцца як цяжкія, асабліва цяжкія, наступае з 14 гадоў, у іншых выпадках — з 18.

***— Жанчыны-педафілы ў вашай практыцы сустракаліся?***

— Па статыстыцы 98 % гвалтаўнікоў — мужчыны. У Беларусі на сёння вядома аб дзвюх жанчынах-педафілах з Магілёўскай вобласці і Гродна.

Некалькі гадоў таму ў міліцыю паступіла інфармацыя, што з тэрыторыі краіны распаўсюджваецца парнавідэа, дзе ў якасці акцёраў выступаюць дзіця і жанчына. Вынікі расследавання шакавалі: матуля займалася сексам са сваім 7-гадовым сынам, дэманстравала гэта немцу па вэб-камеры. Усяго былі запісаны тры ролікі. За відэа «бізнесвумен» атрымлівала грошы. Раней жанчына займалася прастытуцыяй. Яе прыцягнулі да адказнасці ў Беларусі, немец панёс пакаранне ў Германіі.

Гвалт у дачыненні да дзіцяці ў сям'і — рэдкасць. Злачынцы ў такіх выпадках — айчым. Жанчыны, на жаль, расцэньваюць гэта як клопат аб малым, не заўважаюць нездаровых паводзін свайго выбранніка. З дзецьмі, якія атрымалі траўму, абавязкова працуюць медыцынскія работнікі, псіхолагі і псіхатэрапеўты.

***— Ці часта гвалтаўнікі раскайваюцца?***

— Часцей за ўсё педафілы раскайваюцца ў тым, што зрабілі, калі іх толькі затрымалі. Спрабуюць чыстасардэчным прызнаннем змякчыць пакаранне. Але як толькі пагавораць з адвакатам, адступаюць.

Ведаеце, раскрываць падобныя злачынствы для міліцыянера — справа гонару. Так, псіхалагічна працаваць нялёгка. Але менавіта гэта з'яўляецца для нас своеасаблівым штуршком як мага хутчэй абараніць дзіця і пакараць іх крыўдзіцеляў.

***— У чым складанасць раскрыцця падобных злачынстваў?***

— Пошук педафілаў — карпатлівая праца, якая патрабуе сур'ёзных чалавечых і часавых рэсурсаў. Ступень латэнтнасці такіх злачынстваў вельмі высокая. Да таго ж дзеці самастойна рэдка скажуць, што з імі здарылася. Таму мы, дарослыя, абавязаны быць больш уважлівыя. Бацькі павінны ведаць, з кім дзіця сябруе ў сацсетках і месенджарах, пры што размаўляе, сачыць за зменамі ў паводзінах, цікавіцца яго жыццём па-за школай.

Летась МУС сумесна з Мінадукацыі і прадстаўніцтвам Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЕФ) у Беларусі запусціла інфармацыйны рэсурс kids.pomogut.by. Партал прызначаны для атрымання анлайн-кансультацый і інфармацыі па бяспечных паводзінах дзяцей у інтэрнэце, аказання кваліфікаванай дапамогі дзецям, бацькам, педагогам.

**Кацярына АСМЫКОВІЧ.**
**Фота МУС і Ганны ЗАНКАВІЧ.**

Да адказу

# ЗЛАМЫСНІКІ НА ЧЫГУНЦЫ

## Наўмыснае прывядзенне ў непрыгоднасць транспартнага сродку або шляхоў зносін можа пагражаць пазбаўленнем волі да 10 гадоў

**Так, на тэрыторыі рэгіёна зарэгістравана восем фактаў супрацьпраўных дзеянняў з мэтай блакавання руху цягнікоў. Такую інфармацыю паведамляе афіцыйны партал упраўлення ўнутраных спраў Гомельскага аблвыканкама.**

Як адзначаецца, геаграфія зламысных учынкаў шырокая. Усе яны зарэгістраваныя ў розных месцах — на тэрыторыі Гомеля, Добрушскага, Светлагорскага, Гомельскага і Мазырскага раёнаў. Па кожным факце распачатыя крымінальныя справы па артыкуле — наўмыснае прывядзенне ў непрыгоднасць шляхоў зносін. Праваахоўнікамі вызначаюцца асобы зламыснікаў.

— Варта адзначыць, што ў асобных выпадках атрымалася ажыццявіць сваю задуму па прыпыненні руху цягнікоў. Так, 2 лістапада ў 07.35 у раёне прыпыначнага пункта Дударава, што на тэрыторыі чыгуначнага перагона Гомель — Добруш, невядомы пры дапамозе алюмініевага дроту стуліў пары рэек. Гэта прывяло да спрацоўвання забаранальнага сігналу святлафора і стала прычынай затрымкі больш чым на 30 хвілін руху на гэтым участку пасажырскіх цягнікоў рэгіянальных ліній зносін «Гомель—Добруш» і «Добруш—Гомель», — адзначаюць праваахоўнікі.

Як нагадвае **намеснік начальніка УУС Гомельскага аблвыканкама, начальнік міліцыі грамадскай бяспекі Анатоль ВАСІЛЬЕЎ**, парушэнне правіл забяспечэння бяспекі руху на чыгуначным транспарце караецца штрафам ад двух да 50 базавых велічынь. Узнікненне больш цяжкіх наступстваў прадугледжвае крымінальную адказнасць па артыкуле 309 КК (наўмыснае прывядзенне ў непрыгоднасць транспартнага сродку або шляхоў зносін) і караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад шасці месяцаў да 10 гадоў.

Супрацоўнікі органаў унутраных спраў і прадстаўнікі РУП «Гомельскае аддзяленне Беларускай чыгункі» заклікаюць грамадзян не паддавацца дэструктыўным заклікам і не здзяйсняць учынкі, за якія потым прыйдзецца адказваць па ўсёй строгасці закона.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «МЗОР», г. Минск, ул. Октябрьская, 16** |

**Предмет аукциона**
**Месторасположение – г. Минск, ул. Октябрьская, 16**

| Наименование | Общая площадь кв. м | Инвентарный номер | Адрес (№ дома) |
|---|---|---|---|
| **Лот № 1** | | | |
| **Производственный корпус** | 1130,5 | 500/С-49698 | 16 |
| **Диспетчерская** | 54,7 | 500/С-53818 | 16/12 |
| **Здание специализированное иного назначения (литейный цех)** | 7664,8 | 500/С-47329 | 16 |
| **Производственный корпус** | 4340,5 | 500/С-53224 | 16/1 |
| **Компрессорная** | 473,6 | 500/С-54017 | 16/15 |
| **Электропечь термическая** | 39,8 | 500/С-54018 | 16/16 |
| **Здание весовой** | 24,3 | 500/С-54019 | 16/17 |
| **Административно-хозяйственный корпус** | 2323,4 | 500/С-49697 | 16/23 |
| Составные части и принадлежности: проезды, площадки, подкрановый путь, дорожки, подпорные стены, бордюры, ограждения, ворота, калитка, лестница | | | |
| **Склад** | 2328,4 | 500/С-53297 | 16/2 |
| **Склады** | 895,5 | 500/С-53808 | 16/8 |
| **Склады, гаражи** | 453,6 | 500/С-53897 | 16/9 |
| **Склады, административные помещения, агрегатные** | 563,7 | 500/С-53846 | 16/10 |
| **Инженерный корпус** | 3348,6 | 500/С-46093 | 16 |
| **Административно-производственный корпус № 4** | 19710,5 | 500/С-53638 | 16/3 |
| **Склад** | 2193,5 | 500/D-708019487 | д.16п.2 |
| **Строительный цех** | 507,9 | 500/С-53845 | 16/11 |
| **Насосная станция автоматического пожаротушения** | 194,4 | 500/С-54016 | 16/14 |
| **Станция очистки сточных вод** | 305,1 | 500/С-54015 | 16/13 |
| **Градирня** | 39,1 | 500/С-55130 | 16/18 |
| **Ливневая канализационная сеть** | 1077,5 м | 500/С-1029279 | 16 |
| **Хозяйственно-питьевая водопроводная сеть** | 973,2 м | 500/С-1029266 | |
| **Хозяйственно-бытовая канализационная сеть** | 764,5 м | 500/С-1029275 | |
| **Тепловая сеть** | 236,7 м | 500/С-1029272 | |
| **Иное имущество, входящее в состав лота:** внеш. электроснабжение складского корпуса (инв. № 12020054), кабельные телеф. сети (инв. № 12030041), оборудование РП-2 (инв. № 13041207), оборудование РП-2 (инв. № 13041173), конденсат. установки (инв. №№ 13040254, 13040277, 13040260, 13040159, 13040165), трансформатор силовой (инв. № 13041169), ТП (инв. № 13040099, 13040120), пульт распределит. (инв. № 13040780), комплекты ТП (инв. №№ 13040082, 13040076, 13040053, 13040030), комплект. распред. устройство 6КВ (инв. № 13040024), конденсатная установка низ. напр. (инв. № 13040188), лифты грузовые (инв. №№ 28240022, 28240013, 28240065, 28240036, 28240059, 28240042), лифт грузопас. (инв. № 28240071), объекты растительности (деревья 10 шт., газоны 10 шт.) | | | |
| ***Сведения о земельном участке:*** предоставлен продавцу для размещения объектов иного назначения на праве временного пользования пл. **5,1481 га** (срок действия по 31.08.2029). ***Ограничения (обременения)*** прав на земельный участок: расположен в водоохран. зоне; в охран. зонах электрич. сетей (пл. 0,0134 га), зонах сетей и сооружений водоснабжения (пл. 0,5680 га), канализации (пл. 0,1920 га), теплоснабжения (пл. 0,0420 га), объектов газораспределит. системы (пл. 0,0024 га), недвижимых материальных историко-культурн. ценностей (пл. 0,5035 га) | | | |
| **Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 20 870 640,43 бел. руб.** (снижена на 30 %) | | | |
| **Лот № 2** | | | |
| **Производственный корпус № 2** | 9 755,90 | 500/С-53630 | 16/5 |
| Составные части и принадлежности: проезды, площадки, подкрановые пути, дорожки, подпорные стены, бордюр 0,16, ограждения, ворота | | | |
| **Ливневая канализационная сеть** | 122,3 м | 500/С-1029278 | 16/5 |
| **Хозяйственно-бытовая канализационная сеть** | 305,6 м | 500/С-1029274 | |
| **Хозяйственно-питьевая водопроводная сеть** | 133,3 м | 500/С-1029268 | |
| **Иное имущество, входящее в состав лота:** низковольт. конденсат. установка (инв. № 13040142, 13040219), комплектное РУ (инв. № 13040018), силовой трансформатор (инв. № 13041176Д), комплект.ТП (инв. № 13040047), конденсат. установки (инв. № 13040314, 13040308, 13040550, 13040231, 13040248), ТП (инв. № 13040107), электросил. трансформатор (инв. № 13041176), агрегат выпрямит. (инв. № 13050608), объекты растительности (деревья 14 шт., газоны, 4 шт.) | | | |
| ***Сведения о земельном участке:*** предоставлен продавцу для производства машин и оборудования (машиностроения) на праве временного пользования пл. **1,9448 га** (срок действия по 31.08.2029). ***Ограничения (обременения)*** прав на земельный участок: расположен в водоохран. зоне; в охранных зонах электр. сетей (пл. 0,0476 га), зонах сетей и сооружений водоснабжения (пл. 0,3316 га), канализации (пл. 0,0191 га), теплоснабжения (пл. 0,1005 га), объектов газораспределит. системы (пл. 0,0432 га) | | | |
| **Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 3 260 166,29 бел. руб.** (снижена на 30 %) | | | |
| **Лот № 3** | | | |
| **Заводоуправление** | 2763,5 | 500/С-53298 | 16/4 |
| Составные части и принадлежности: проезд, дорожка, площадки, ограждение, бордюры | | | |
| **Производственный корпус** | 13365,7 | 500/С-45217 | 16/24 |
| **Технологическая котельная** | 200,30 | 500/С-53824 | 16/7 |
| **Тепловая сеть** | 43,8 м | 500/С-1029271 | 16/4 |
| **Ливневая канализац. сеть** | 547,1 м | 500/С-1029280 | |
| **Хозяйственно-бытовая канализационная сеть** | 161,3 и 169 м | 500/С-1029273, 500/С-1029277 | |
| **Хозяйственно-питьевая водопроводная сеть** | 68,4 и 295,1 м | 500/С-1029269, 500/С-1029267 | 16 |
| **Иное имущество, входящее в состав лота:** внутриплощад. каб. сети (инв. № 12020084), каб. телеф. сети (инв. № 12030035), комплект.ТП (инв. № 13040065), конденсат. установка низ. напр. (инв. № 13040194), конденсат. установки (инв. № 13040294, 13040283, 13040171), низковольт. конденсат. установка (инв. № 13040202), объекты растительности (деревья 13 шт., газоны, 2 шт.) | | | |
| ***Сведения о земельных участках,*** предоставленных продавцу для размещения объектов иного назначения: 1) на праве временного пользования пл. **1,94 га** (срок действия по 31.08.2029). ***Ограничения (обременения)*** прав на земельный участок: расположен в водоохран. зоне; в охран. зона линий связи и радиофикации (пл. 0,0268 га), в охран. зонах электрич. сетей (пл. 0,0339 га), зонах сетей и сооружений водоснабжения (пл. 0,4485 га), канализации (пл. 0,1234 га), теплоснабжения (пл. 0,0322 га), объектов газораспределит. системы (пл. 0,0975 га), недвижимых материальных историко-культурных ценностей (пл. 0,3730 га); 2) на праве долевой аренды (срок действия по 31.03.2026) для размещения технологич. котельной пл. **0,0991 га** с ограничениями | | | |
| **Начальная цена лота № 3 с НДС 20 % – 18 619 054,40 бел. руб.** | | | |

**Обременения:** площади зданий частично сданы в аренду. Здания с инвентар. номерами 500/С-53224 (лот № 1), 500/С-46093 (лот № 1), 500/С-53298 (лот № 3) находятся в залоге у банков. Более подробную информацию по залогу и арендаторам можно узнать у организатора аукциона.

В соответствии с градостроительным проектом детального планирования, на земельных участках, на которых расположены предметы аукциона, предусмотрено размещение объектов торгово-развлекательного, выставочно-музейного, музейно-просветительского назначения, многоуровневой автостоянки.

На территории лота № 1 расположено защитное сооружение гражданской обороны, которое не входит в состав лота

**Задаток 1 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в ОАО «Белинвестбанк» (г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **20** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 30.10.2020

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **15.12.2020 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **14.12.2020 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by** |

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

## Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Березинский льнозавод» проводит повторный открытый аукцион по продаже недвижимого имущества в составе:

**Лот № 1:** главный производственный корпус, общей площадью 3765,8 кв. м, инв. № 611/С-32645, расположенный на земельном участке площадью 1,5960 га с кадастровым номером 620450100001003603 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60, корп. 1.

Начальная цена с НДС (20 %) – **347 237,28 бел. руб**. Задаток 5 % от начальной цены (**17 361,86 бел. руб.**).

**Лот № 2:** административно-бытовой корпус, общей площадью 1630,5 кв. м, инв. № 611/С-32540, расположенный на земельном участке площадью 0,2716 га с кадастровым номером 620450100001003599 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60.

Начальная цена с НДС (20 %) – **158 970,36 бел. руб.** Задаток 5 % от начальной цены (**7 948,52 бел. руб.**).

**Лот № 3:** склад-арочник, общей площадью 772 кв. м, инв. № 611/С-32657, расположенный на земельном участке площадью 0,1541 га с кадастровым номером 620450100001003594 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60, корп. 4.

Начальная цена с НДС (20 %) – **76 506,12 бел. руб.** Задаток 5 % от начальной цены (**3 825,31 бел. руб.**).

**Лот № 4:** склад-арочник, общей площадью 651,7 кв. м, инв. № 611/С-32658, расположенный на земельном участке площадью 0,1659 га с кадастровым номером 620450100001003595 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60, корп. 3.

Начальная цена с НДС (20 %) – **59 578,74 бел. руб.** Задаток 5 % от начальной цены (**2 978,94 бел. руб.**).

**Лот № 5:** здание котельной, общей площадью 947,2 кв. м, инв. № 611/С-32655 и кастросборник, общей площадью 151,8 кв. м, инв. № 611/С-32801, расположенные на земельном участке площадью 0,4438 га с кадастровым номером 620450100001003597 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60.

Начальная цена с НДС (20 %) – **106 006,32 бел. руб.** Задаток 5 % от начальной цены (**5 300,32 бел. руб.)**.

**Лот № 6:** автовесовая, общей площадью 193,2 кв. м, инв. № 611/С-32800, расположенная на земельном участке площадью 0,0435 га с кадастровым номером 620450100001003598 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60, корп. 10.

Начальная цена с НДС (20 %) – **25 835,76 бел. руб.** Задаток 5 % от начальной цены (**1 291,79 бел. руб.**).

**Лот № 7:** блок вспомогательных помещений, общей площадью 515,2 кв. м, инв. № 611/С-32646 и навесной склад, общей площадью 309,4 кв. м, инв. № 611/С-32804, расположенные на земельном участке площадью 0,5540 га с кадастровым номером 620450100001003596 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60.

Начальная цена с НДС (20 %) – **89 739,90 бел. руб.** Задаток 5 % от начальной цены (**4 486,99 бел. руб.**).

**Лот № 8:** насосная станция 2-го подъема, общей площадью 101,5 кв. м, инв. № 611/С-32802, расположенная на земельном участке площадью 0,7992 га с кадастровым номером 620450100001003592 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60.

Начальная цена с НДС (20 %) – **30 506,22 бел. руб**. Задаток 5 % от начальной цены (**1 525,31 бел. руб.**).

**Лот № 9:** шоха № 1, общей площадью 3448 кв. м, инв. № 611/С-32654, шоха № 2, общей площадью 3442 кв. м, инв. № 611/С-32653 и подвальное помещение, общей площадью 70,5 кв. м, инв. № 611/С-32803, расположенные по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60.

Начальная цена с НДС (20 %) – **257 614,02 бел. руб.** Задаток 5 % от начальной цены (**12 880,70 бел. руб.**).

**Стоимость лотов снижена на 55 %.**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Предыдущие извещения опубликованы в газете «Белорусская Нива» («Сельская газета») 07.09.2017, 07.12.2017 и «Звязда» от 23.04.2018, 19.12.2018, 12.03.2019, 05.09.2019, 17.12.2019, 03.04.2020, 12.08.2020.

Торги проводятся в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (с изменениями и дополнениями).

Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель). Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **16.12.2020** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **15.12.2020** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: 8 (017) 516-80-65, 8 (029) 102-21-17.**

ВНИМАНИЮ ПРЕДПРИЯТИЙ, ОРГАНИЗАЦИЙ И ИНДИВИДУАЛЬНЫХ ПРЕДПРИНИМАТЕЛЕЙ!

# Комитетом государственного имущества Гродненского областного исполнительного комитета ПРОВОДЯТСЯ АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ НЕИСПОЛЬЗУЕМОГО ИМУЩЕСТВА, НАХОДЯЩЕГОСЯ В СОБСТВЕННОСТИ ВОЛКОВЫССКОГО РАЙОНА

К ПРОДАЖЕ ПРЕДЛАГАЕТСЯ:

**1) Комплекс № 9 бывшего военного городка в Волковысском районе, Российский с/с, 38, 38/2, 38/3, 38/4, 38/5, 38/6, 38/7 около г. п. Россь.**

Начальная цена предмета аукциона – 685 320 руб. 98 коп.
Размер задатка – 70 000 руб.

**2) Комплекс № 10 бывшего военного городка в Волковысском районе, Российский с/с, 36, 36/1, 36/2 около г. п. Россь.**

Начальная цена предмета аукциона – 108 645 руб. 22 коп.
Размер задатка – 11 000 руб.

**3) Комплекс объектов бывшего военного городка № 11 в Волковысском районе, Российский с/с, 31, 31/1-31/13 около д. Лозы.**

Начальная цена предмета аукциона – (441 487 руб. 41 коп.) 441 317 руб. 41 коп. +170 руб. каб. линия эл.
Размер задатка – 45 000 руб.

**4) Комплекс № 17 бывшего военного городка в Волковысском районе, Российский с/с, 47, 47/1-47/6 около г. п. Россь.**

Начальная цена предмета аукциона – 722 018 руб. 19 коп.
Размер задатка – 75 000 руб.

Аукцион состоится **28.12.2020 г. в 15.30.**
Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.
Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – **21.12.2020 г. до 16.00**.

**5) Комплекс объектов цеха по производству красного кирпича по ул. Осипенко, 21, 21/1-21/3, 21/8, 21/11-21/14 в г. Волковыске.**

Начальная цена предмета аукциона – 29 базовых величин.
Размер задатка – 1 базовая величина.

Аукцион состоится **17.12.2020 г. в 11.30.**
Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.
Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – **11.12.2020 г. до 17.00**.

**6) Здание тренажера с пристройкой, инженерными сетями и объектами благоустройства по ул. Красноармейской, 57 в г. п. Россь Росского с/с Волковысского района.**

Начальная цена предмета аукциона – 199 338 руб. 31 коп.
Размер задатка – 20 000 руб.

**7) Здание учебного корпуса со спортивным залом, инженерными сетями и объектами благоустройства по ул. Красноармейской, 54 в г. п. Россь Росского с/с Волковысского района.**

Начальная цена предмета аукциона – 19 098 руб. 26 коп.
Размер задатка – 2 000 руб.

**8) Комплекс № 6 бывшего военного городка в Волковысском районе, Российский с/с, 6, 6/2, 6/3, 6/4, 6/5, 6/6, 6/7, 6/8 около г. п. Россь.**

Начальная цена предмета аукциона – 470 517 руб. 65 коп.
Размер задатка – 50 000 руб.

**9) Комплекс № 7 бывшего военного городка в Волковысском районе, Российский с/с, 8, 8/3 около д. Студенец.**

Начальная цена предмета аукциона – 207 377 руб. 44 коп.
Размер задатка – 25 000 руб.

**10) Комплекс № 8 бывшего военного городка в Волковысском районе, Российский с/с, 43, 43/1, 43/2, 43/3, 43/4, 43/5, 43/6, 44 около г. п. Россь.**

Начальная цена предмета аукциона – 789 830 руб. 71 коп.
Размер задатка – 80 000 руб.

Аукцион состоится **28.12.2020 г. в 15.00.**
Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.
Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – **21.12.2020 г. до 16.00**.
Подробная информация по телефонам:
в городе Волковыске 8 (01512) 5 13 44, 2 06 03.
в городе Гродно 8 (0152) 62 39 11, 62 39 24, 62 39 23, 62 39 31
Дополнительная информация размещена на сайте: **https://au.nca.by**

УНП 500042135

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

## Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «ЗАВОД РЕМБЫТТЕХНИКА» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже одним лотом комплекса зданий в составе:

- **здание производственного корпуса, компрессорной с инв. № 630/С-49737, общ. пл. 1664,8 кв. м;**
- **здание конторы с проходной** *(составные части и принадлежности: АБК, проходная, забор)* **с инв. № 630/С-49735, общ. пл. 389,9 кв. м;**
- **склад и гараж с инв. № 630/С-49739, общ. пл. 872,2 кв. м.;**
- **здание гаража № 2 с инв. № 630/С-49736, общ. пл. 64,9 кв. м.;**
- **здание склада № 2 с инв. № 630/С-49738, общ. пл. 61,2 кв. м.**

**Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 623850100002003506** ***(право постоянного пользования)*** **площадью 1,2340 га по адресу: Минская область, г. Молодечно, ул. Молодежная, 8А.**

*Часть объектов обременена договорами аренды. Сведения об арендаторах можно получить у организатора аукциона.*

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона тепловых сетей, пл. 0,0236 га.*

*Земельный участок имеет ограничения прав: сервитут установлен в целях обеспечения прохода и проезда, прокладки и эксплуатации линий связи и трубопроводов, оборудования (КТПН-236 и внутреннее оборудование), обеспечения водоснабжения и мелиорации, а также других нужд, которые не могут быть обеспечены без установления сервитута. Общая площадь сервитута составляет 0,7 га.*

*Сервитут является возмездным. Плата за сервитут устанавливается в размере 15 % произведения площади сервитута на величину ставки земельного налога по Молодечненскому району, установленных приложением 3 к Налоговому кодексу за 1 гектар.*

Начальная цена с НДС (20 %) – **542 907,84** бел. руб. *Цена снижена на 20 %.*

Задаток 10 % от начальной цены – **54 290,78** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, г. Минск, БИК в формате IBAN BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 3 (трех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.** Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 15.07.2020. Аукцион состоится **18.01.2021** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **15.01.2021** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: 8 (017) 516-80-65, 516-80-64, 8 (029) 102-21-17.**

УНП 600153255

# ШКОЛА — ПРАСТОРА ДЛЯ ДЫЯЛОГУ

## ПАЧУЦЬ ДЗІЦЯ

— Мы адкрыліся ў верасні 2019 года. За мінулы час супрацоўнікі цэнтра суправаджалі 26 выпадкаў крызіснага рэагавання, у тым ліку 8 экстранных. Сярод іх ёсць асаблівыя выпадкі суправаджэння, тыя, якія паказалі эфектыўнасць каманднай работы і высокі прафесіяналізм супрацоўнікаў школ у прафілактыцы крызісных сітуацый, — расказала Вольга Мацюхова. — Напрыклад, зусім нядаўна ў цэнтр звярнулася вучаніца адной з мінскіх школ. Па тэлефоне яна расказала пра вялікую колькасць перажыванняў і цяжкасцяў, у тым ліку падзялілася сваім думкамі пра нежаданне жыць. У такіх складаных сітуацыях, калі ёсць высокая суіцыдальная рызыка, неабходна дзейнічаць аператыўна. Дзякуючы гатоўнасці адміністрацыі школы да супрацоўніцтва і разумення важнасці хуткага рэагавання ўжо на наступную раніцу псіхолагі цэнтра змаглі ўстанавіць асабісты кантакт з дзіцем і яго бацькамі, разам са спецыялістамі школы намецілі далейшыя крокі дзеянняў.

Гэта адзін з прыкладаў, як сумесная работа цэнтра і ўстановы адукацыі дазваляе своечасова прыйсці на дапамогу і прадухіліць развіццё крызіснай сітуацыі.

— Аналізуючы выпадкі, на якія выязджалі нашы спецыялісты, мы ўбачылі актуальнасць узмацнення прэвентыўных мер па папярэджванні крызісных сітуацый у адукацыйным асяроддзі, — падкрэсліла начальнік цэнтра. — Таму ўжо распрацавана вучэбная праграма павышэння кваліфікацыі «Работа педагога ўстановы адукацыі па прафілактыцы і вырашэнні складаных педагагічных і крызісных сітуацый» і «Метадычныя рэкамендацыі для прафілактыкі ўзнікнення і вырашэння канфліктаў у школе».

Як заўважыла спецыяліст, ва ўсіх дзіцячых групах прысутнічае пэўны канфліктны патэнцыял. Канфлікты могуць узнікаць на фоне індывідуальных асаблівасцяў дзяцей і асаблівасцяў іх паводзін. Менавіта таму прафесія педагога патрабуе пэўных камунікатыўных навыкаў. Настаўніку карысна мець веды і вопыт па ўзаемадзеянні з цяжкімі дзецьмі. Але вельмі важна не вылучаць іх з класа, паколькі гэта можа прывесці да стыгматызацыі дзіцяці. Уменне пераключацца, імправізаваць — важныя навыкі. Праца настаўніка — гэта творчы працэс: калі не падыходзіць нейкі са спосабаў камунікацыі, неабходна шукаць новы, абмяркоўваць свае стратэгіі паводзін з калегамі, сумесна выпрацоўваць больш прыдатныя.

Вольга Мацюхова звярнула ўвагу на ролю адміністрацыі ўстановы адукацыі ў стварэнні ўмоў для раскрыцця творчага патэнцыялу педагогаў. «У цэлым вельмі важна, як у школе ставяцца да настаўніка. Добры настаўнік — добры вучань. Не наадварот. Таму настаўнік павінен быць галоўным чалавекам у школе, а мерапрыемствы па прафілактыцы прафесійнага выгарання — сістэматычнымі. Ва ўстанове адукацыі павінна быць сфарміравана адзіная стратэгія прафілактыкі і рэагавання на складаныя і крызісныя сітуацыі ў адукацыйным асяроддзі», — падкрэсліла яна. — Школа — гэта найперш прастора для дыялогу, за якім стаіць адукацыя і выхаванне. Калі нехта з дзяцей перашкаджае вучыцца, значыць, за іх паводзінамі нешта крыецца. Дзіця выкарыстоўвае негатыўныя паводзіны для вырашэння нейкай праблемы, бо не ведае іншых спосабаў. Цеснае ўзаемадзеянне з бацькамі дапаможа раскрыць прычыны такіх паводзін і выпрацаваць алгарытм камунікацыі. Задача дарослых — пачуць дзіця. Вельмі важна ў гэтай прасторы дыялогу адмовіцца ад стратэгіі пошуку вінаватых. Нават калі яны і будуць знойдзены, сітуацыя ўжо здарылася, змяніць можна толькі яе наступствы, але не саму сітуацыю. Не трэба спрабаваць справіцца з усім самастойна, у складанай сітуацыі важна быць гатовым да каманднай работы ў адной звязцы «адміністрацыя, настаўнік, бацькі, сацыяльны педагог, педагог-псіхолаг».

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



## КРЫЗІСНАЯ ПАДЗЕЯ

**Загадчык кафедры сацыяльнай і сямейнай псіхалогіі Інстытута псіхалогіі БДПУ імя Максіма Танка Наталля ПУЗЫРЭВІЧ** лічыць, што педагог павінен валодаць не толькі прафесійнымі ведамі. Не менш важны яго асобасны патэнцыял і маральныя якасці, якія даюць вучню ўпэўненасць у тым, што ён можа абапірацца на гэтага чалавека, давяраць яму, узаемадзейнічаць з ім на роўных. «Педагог, які стварае ў калектыве дружалюбны мікраклімат, здольны весці за сабой і паказваe, што сёння вы гэта можаце зрабіць разам са мной, але заўтра наступіць момант, калі вы зможаце гэта зрабіць самі», — разважае Наталля Пузырэвіч.

Кажучы аб крызісных сітуацыях, якія могуць узнікаць у жыцці дзіцяці, загадчык кафедры адзначыла, што тут галоўным памочнікам павінен быць педагог: «Крызісная сітуацыя — значыць, незнаёмая, невядомая сітуацыя, якая выходзіць за рамкі звыклага жыццёвага вопыту дзіцяці. Пытанне заключаецца ў тым, ці часта такія сітуацыі здараюцца ў дзяцей? Часта, бо для таго, каб яна не стала для малога крызіснай, трэба супаставіць тую сітуацыю, якая ёсць цяпер, з яго папярэднім жыццёвым вопытам. А жыццёвага вопыту ў дзяцей няшмат, таму ўсё, што адбываецца неардынарнае і нязвыклае, турбуе і палохае іх. Другі аспект. Крызісная сітуацыя можа стаць крызіснай падзеяй, гэта значыць, акалічнасцю, якая падзеліць жыццё дзіцяці на «да» і «пасля». Тады яму трэба будзе шукаць новыя алгарытмы для далейшага жыцця, і справіцца без дарослага вельмі праблематычна. У гэтай сувязі роля педагога з'яўляецца вызначальнай».

Па словах Наталлі Пузырэвіч, у Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце для фарміравання і выхавання асобы педагога, адкрытага сучаснаму вопыту, распрацавана шмат спецкурсаў, факультатыўных заняткаў і вучэбных дысцыплін. Дыягнастычны інструментарый, які выкарыстоўваецца ў псіхалогіі, таксама апрабуецца і абнаўляецца. «Мы кантактуем са школамі, на базе якіх у нас ёсць філіялы. У кантакце з настаўнікамі і псіхолагамі ўстаноў адукацыі мы ўдакладняем, які ў іх ёсць запыт на канкрэтную тэму і праблему. І менавіта па гэтай праблематыцы нашы студэнты пішуць работы. Потым прыходзяць на практыку і апрабуюць свае распрацоўкі. Важны момант — гэта пераемнасць, што дазваляе абменьвацца вопытам і рухацца наперад», — растлумачыла яна.

Загадчык кафедры ўпэўнена: педагог павінен арыентавацца не на сімптаматычны падыход, калі няшчасце ў паводзінах дзіцяці ўжо становіцца нейкім звыклым алгарытмам. «Важна адсачыць першыя прыкметы, калі змяняецца настрой, калі дзіця адасабляецца, перастае быць актыўным, замыкаецца ў сабе. І вось ад такіх першых маркераў, якія настаўнік можа адсачыць, залежыць магчымасць выратавання дзіцяці на ранніх этапах. І роля педагога, як аўтарытэта, тут вызначальная», — дадала Наталля Пузырэвіч.

## СЕМ КРОКАЎ

— Апошнім часам павялічваецца колькасць зваротаў да спецыялістаў псіхалагічнага профілю па праблеме булінгу, — паведаміла **ментар мадэлі «Сяброўскае і падтрымліваючае асяроддзе ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі», педагог-псіхолаг Ілляна МАТВІЕНКА.** — Адна з самых вялікіх праблем заключаецца ў тым, што тэма булінгу ва ўстановах адукацыі табуіруецца, альбо там дзейнічаюць устаноўкі, што булінг, як і крызісныя сітуацыі, з'яўляецца неад'емнай часткай сталення і існавання ў калектыве, што гэта «школа жыцця», таму падлеткам неабходна спраўляцца самастойна. І калі мы кажам, што педагогі, падлеткі, бацькі не баяцца звяртацца па дапамогу, — гэта паказчык, што першы этап праекта па стварэнні сяброўскага і падтрымліваючага асяроддзя ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі спрацаваў добра. На тэму булінгу можна і трэба выказвацца ўслых, можна і трэба звяртацца па дапамогу да спецыялістаў і да дарослых.

Нацыянальная антыбулінгавая мадэль у рамках эксперыментальнай дзейнасці ўкараняецца з пачатку бягучага навучальнага года ў 26 установах адукацыі нашай краіны. Яна стала вынікам навукова-даследчай работы па адаптацыі харвацкай мадэлі «Бяспечнае і падтрымліваючае асяроддзе ў школах», праведзенай БДПУ ў партнёрстве з Прадстаўніцтвам Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЕФ).

На шляху да бяспечнай школы будзе сем крокаў — сем этапаў рэалізацыі праграмы: ад інфармавання ўдзельнікаў адукацыйнага працэсу пра гвалт, стварэння экасістэмы каштоўнасцяў у школьным калектыве, вызначэння правілаў паводзін, укаранення негвалтоўных метадаў выпраўлення памылкі (маецца на ўвазе метад аднаўлення каштоўнасцяў) да пашырэння магчымасцяў сяброўскага асяроддзя і стварэння сістэмы дыферэнцыяванай дапамогі навучэнцам. Укараненне антыбулінгавай мадэлі будзе спрыяць фарміраванню ў вучняў школ узаемнай павагі, уключэнню ў працэс прафілактыкі гвалту бацькоў, настаўнікаў і прадстаўнікоў мясцовых органаў улады. Рабоце з бацькамі адводзіцца вельмі важная роля, бо калі ў школе ўкараняюцца адны каштоўнасці, а ў сям'і — іншыя, то, нават нягледзячы на аўтарытэт педагога, дамагчыся чаканага эфекту будзе праблематычна.

— Праект разлічаны на тое, каб дапамагчы падлеткам, бацькам і педагогам навучыцца не дапускаць такіх сітуацый. Бачыць маркеры, калі падлеткі пачынаюць адчуваць сябе некамфортна, і разумець, у якія моманты гэта з'яўляецца проста канфліктам, а ў якія — булінгам і ўказвае на не зусім здаровыя ўзаемаадносіны ў падлеткавым калектыве, — падкрэслівае Ілляна Матвіенка. — У дарослых ёсць магчымасць убачыць, якія моманты ў іх стасунках з падлеткамі, нават адзін з адным, могуць справакаваць з'яўленне булінгу ў вучнёўскіх калектывах.

Перавага нацыянальнай антыбулінгавай мадэлі — у яе прафілактычнай накіраванасці: яна дапамагае падтрымліваць спрыяльнае асяроддзе ў школьных калектывах і не даваць развіцца негатыўным тэндэнцыям.

---

## Школа для бацькоў

# Як размаўляць з дзецьмі на далікатныя тэмы?

**Курс «SexEd» палавога выхавання для бацькоў падлеткаў распрацаваў студэнт БДУ.**

Ідэя належыць трэццякурсніку факультэта сацыякультурных камунікацый Артуру Корбуту. У каманду распрацоўшчыкаў увайшлі таксама другакурсніца факультэта міжнародных адносін БДУ Аліна Самойленка і псіхолаг-практык, выпускніца БДПУ імя Максіма Танка Міла Ведрава.

Актуальнасць ініцыятывы абумоўлена адсутнасцю прафесійнай падрыхтоўкі сям'і ў пытаннях палавога выхавання дзяцей. Адукацыйны курс «SexEd» арыентаваны на бацькоў, якія адчуваюць збянтэжанасць і сарамлівасць пры абмеркаванні гэтых пытанняў і жадаюць выбудаваць даверлівыя адносіны з дзецьмі-падлеткамі.

Цяпер сем'ям у нашай краіне прапануюцца толькі індывідуальныя кансультацыі псіхолагаў і сексолагаў. Адметнасцю курса «SexEd» з'яўляецца комплексны падыход у навучанні, як аптымальна весці гутарку на анатама-фізіялагічныя і сацыяльна-псіхалагічныя тэмы з дзецьмі.

Праграма ўключае 12 запісаных лекцый па вывучэнні псіхасексуальнага развіцця, гендарнай ідэнтычнасці і экспрэсіі, адносін з дзецьмі падчас іх першай закаханасці і г. д. Слухачам будзе прапанавана таксама выкананне тэарэтычных і практычных заданняў. Удзельнікі праграмы змогуць абмяняцца думкамі з іншымі бацькамі і псіхолагам, а таксама пры неабходнасці звярнуцца па прафесійную кансультацыю ў чат падтрымкі.

На цяперашнім этапе студэнт працуе над запаўненнем сайта і сацыяльных сетак. «SexEd» будзе размешчаны на навучальнай платформе GetCourse. Запуск пілотнай версіі плануецца ў студзені 2021 года.




Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Трэба дадаць, што Артур Корбут са сваёй ініцыятывай «SexEd» стаў пераможцам конкурсу інавацыйных праектаў БДУ «INNSTART BSU». У якасці ўзнагароды ён атрымаў фінансавую падтрымку ад НТП «Унітэхпрам БДУ» і магчымасць удзелу ў акселерацыйнай праграме кампаніі KrokIT.

**Матэрыялы падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.**

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

# КОЛЬКАСЦЬ ЛЮДЗЕЙ З НЕДЫЯГНАСТАВАНЫМ ВІЧ ПАВЯЛІЧВАЕЦЦА

## Хоць лічба новых выпадкаў у Беларусі, Расіі і Украіне змяншаецца

**Згодна са статыстыкай Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, на планеце з ВІЧ жыве больш за 38 мільёнаў чалавек. За апошнія 30 гадоў каля 33 мільёнаў памерла ад СНІДу. У Беларусі за апошнае дзесяцігоддзе найбольшая колькасць новых выпадкаў рэгіструецца ва ўзроставай групе старэйшых за 35 гадоў. Пераважае гетэрасексуальны шлях перадачы ВІЧ. На 1 лістапада 2020 года ў Беларусі было выяўлена 22 792 чалавекі з ВІЧ-інфекцыяй. «Ацэначная» колькасць людзей, якія жывуць з ВІЧ у нашай краіне, складае 28 тысяч чалавек.**

У Еўрапейскім рэгіёне працягвае расці колькасць новых выпадкаў ВІЧ-інфекцыі. Каля 79 % новых выпадкаў летась прыпадала на яго ўсходнюю частку, а гэта краіны Усходняй Еўропы і Цэнтральнай Азіі. Такія звесткі паведаміў **каардынатар праграм па інфекцыйных хваробах краінавага офіса СААЗ у Беларусі Вячаслаў ГРАНЬКОЎ.** Яшчэ адна праблема — павялічваецца колькасць асоб, якія жывуць з недыягнаставаным ВІЧ. І большая іх частка таксама жыве ва ўсходняй частцы Еўрапейскага рэгіёна. А позняя дыягностыка патрабуе амаль у чатыры разы больш затрат, чым калі інфекцыя выяўлена своечасова.

Эксперт адзначыў і пазітыўную тэндэнцыю ў Еўрапейскім рэгіёне: адбываецца скарачэнне тэмпаў росту новых выпадкаў і стабілізацыя эпідэміялагічнага працэсу ў Расіі і Украіне. Гэта таксама ўплывае і на сітуацыю ў нашай краіне, паколькі мы з'яўляемся найбліжэйшымі суседзямі.

Дзякуючы сумесным намаганням міжнародных, нацыянальных і няўрадавых арганізацый колькасць новых выпадкаў ВІЧ-інфекцыі ў свеце з кожным годам зніжаецца. Спецыялісты мяркуюць, што гэта звязана з павелічэннем ахопу колькасці хворых эфектыўным лячэннем — антырэтравіруснай тэрапіяй.

Паводле слоў **дацэнта кафедры інфекцыйных хвароб і дзіцячых інфекцый Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Мікалая ГАЛАБАРОДЗЬКІ,** у 2020 годзе ў Беларусі таксама адзначаецца зніжэнне новых выпадкаў ВІЧ у параўнанні з мінулым годам амаль на трэць.

— У 2020 годзе ўвага ўсяго свету прыкавана да пандэміі COVID-19 і яе ўплыву на жыццё і дабрабыт людзей. І гэтыя падзеі яшчэ раз паказалі, наколькі цесна наша здароўе звязана з іншымі важнымі пытаннямі — правамі чалавека, гендарнай роўнасцю і сацыяльнай абаронай. COVID-19 прадэманстраваў, што падчас любой пандэміі бяспека ўсіх залежыць ад бяспекі кожнага, — кажа **выконваючы абавязкі загадчыка аддзела прафілактыкі ВІЧ-інфекцыі і парэнтэральных вірусных гепатытаў Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Святлана СЕРГЕЕНКА.** — Каб дасягнуць поспеху, неабходна аказваць дапамогу ўсім, хто мае ў ёй патрэбу. Выкараненне стыгмы і дыскрымінацыі, прымяненне падыходаў, заснаваных на правах чалавека і гендарнай роўнасці, — вось галоўныя ўмовы спынення ў свеце пандэмій ВІЧ і COVID-19.

У нашай краіне створана сістэма, якая забяспечвае максімальную даступнасць да кансультавання і тэсціравання на ВІЧ-інфекцыю. Прайсці добраахвотнае тэсціраванне на ВІЧ, у тым ліку ананімнае, можна ў любой лячэбнай установе, у якой маецца працэдурны кабінет. Таксама ў краіне на базе грамадскіх некамерцыйных арганізацый функцыянуюць ананімна-кансультацыйныя пункты, якія аказваюць паслугі па кансультаванні і тэсціраванні на ВІЧ-інфекцыю для найбольш уразлівых да ВІЧ-інфекцыі груп насельніцтва (спажыўцы ін'екцыйных наркотыкаў, жанчыны секс-бізнесу, мужчыны, якія ўступаюць у сексуальныя адносіны з мужчынамі).

Усе ВІЧ-пазітыўныя пацыенты ў Беларусі, якія знаходзяцца на дыспансерным назіранні, атрымліваюць лекавыя сродкі для антырэтравіруснай тэрапіі бясплатна. Колькасць такіх пацыентаў на сёння складае каля 19 тысяч чалавек. Своечасова пачаўшы лячэнне і прытрымліваючыся ўсіх указанняў урача, людзі з ВІЧ могуць пражыць доўгае і паўнавартаснае жыццё. Па якасці жыцця ВІЧ-пазітыўныя пацыенты, дзякуючы гэтым лекавым прэпаратам, амаль нічым не адрозніваюцца ад здаровых людзей.


flickr.com

Разам з тым, па словах Вячаслава Гранькова, сёння для таго, каб паставіць дыягназ, неабходна зрабіць тры тэсты. Актуальным застаецца пытанне паскарэння тэрмінаў пастаноўкі дыягназу, і ўжо вядзецца работа над зняненнем існуючага алгарытму дыягностыкі. Чакаецца, што новаўвядзенні пачнуць дзейнічаць у 2021 годзе.

### Тэст на ВІЧ і вірусныя гепатыты — бясплатна і ананімна

У працэдурным кабінеце аддзела прафілактыкі ВІЧ-інфекцыі і парэнтэральных вірусных гепатытаў ГУ РЦГЭіГЗ (Мінск, вул. Клары Цэткін, 4, працэдурны кабінет № 301, 3-і паверх) у перыяд з 20 лістапада да 24 снежня 2020 года можна прайсці добраахвотнае бясплатнае ананімнае экспрэс-тэсціраванне на ВІЧ па сліне і экспрэс-тэсціраванне на вірусныя гепатыты В і С па крыві, атрымаць кансультацыю ўрача-эпідэміёлага і псіхолага па пытаннях, што датычацца ВІЧ-інфекцыі, а таксама інфармацыйна-асветніцкія матэрыялы, сродкі індывідуальнай аховы (прэзервативы).

Час забору крыві для экспрэс-тэсціравання з 11.00 да 13.00 і з 14.00 да 15.00.

**Прайсці тэсціраванне можна па папярэднім запісе па тэлефоне +375 17 321 22 68.**

**Вірус імунадэфіцыту чалавека (ВІЧ) — інфекцыя, якую выклікаюць рэтравірусы двух тыпаў, што жывуць у пэўных клетках крыві, разбураюць іх і выклікаюць паступовае аслабленне імуннай сістэмы. Пры адсутнасці лячэння імунная сістэма прыгнятаецца. Пакуль зусім не перастае змагацца з небяспечнымі для жыцця інфекцыямі і хваробамі.**

Будзь у курсе

# Ці небяспечнае нашэнне медыцынскай маскі?

## І які ўплыў яна аказвае на здароўе


24.kz

**Некаторыя незадаволены тым, што без масак нельга з'яўляцца ў краме і транспарце. Маскі яны называюць «наморднікамі» і «газавымі камерамі». Нібыта пад маскай назапашваецца вуглякіслы газ, які павольна ўсіх нас труціць. Інтэрнэт апанавалі сумнеўныя, але вельмі шакіруючыя эксперыменты.**

Тэлепрадзюсар з ЗША Дэль Бігтры ставіў эксперымент на сваім сыне і ў прамым эфіры замяраў узровень вуглякіслага газу, які назапашваецца пад маскай на твары 11-гадовага хлопчыка. Няўжо ад іх сапраўды больш шкоды, чым карысці?

Аднак спецыялісты супакойваюць: вы ў бяспецы, а такія эксперыменты некарэктныя. Справа ў тым, што прамысловыя газааналізатары падыходзяць толькі для вымярэнняў у памяшканнях, а не ў лакальнай кропцы на выдыху. Не дзіва, што прафесіяналы паднялі на смех эксперымент Бігтры. Тым больш што гэты прадзюсар даўно вядомы як аўтар ілжэнавуковых праектаў.

Каб сапраўды вызначыць, наколькі добра арганізму дыхаецца, трэба вымяраць узровень сатурацыі, то-бок узровень кіслароду ў крыві. І ў медыцыне гэта даўно робяць з дапамогай пульсаксіметра. І вось такія эксперыменты якраз паказваюць, што ўсё ў норме.

Пульманолагі пацвярджаюць, што маска забяспечвае дастатковае паступленне чыстага паветра пры інтэнсіўных удыху і выдыху. Нягледзячы на тое што ў падмасачнай прасторы можа павялічыцца колькасць вуглякіслага газу, у арганізме прынцыпова нічога не мяняецца.

Да таго ж урачы, асабліва апошнія паўгода, працуюць у масках па шмат гадзін запар. А хірургі і зусім палову рабочага часу праводзяць у масках. Ёсць, вядома, некаторыя нязручнасці, але яны ніяк не звязаныя з кіслародным галаданнем ці атручваннем вуглекіслатой. А карысць ад масак несувымерна большая, чым любыя нязручнасці.

# АРАНЖАВЫ ДОКТАР

## Чым карысны гарбуз

Гарбуз — гэта свайго роду прыродны вітамінна-мінеральны комплекс, неабходны ўсім нам з надыходам халадоў. Ён цікавы не толькі разнастайнасцю памераў, формаў і колераў, смакавымі якасцямі, але і ў першую чаргу, сваёй карысцю для здароўя. У прыватнасці, як і ўсе прадукты аранжавага і жоўта-аранжавага колеру, гарбуз утрымлівае бэта-карацін — рэчыва, якое з'яўляецца папярэднікам вітаміну А. Той, у сваю чаргу, асноўны вітамін, які абараняе слізістыя верхніх дыхальных шляхоў ад пранікнення вірусаў і бактэрый.

Ды і ўвогуле гарбуз — скарбніца вітамінаў, мінералаў і карысных рэчываў.

— У яго склад уваходзяць вітаміны групы В, С, А, Е, D, PP, K, мікраэлементы F, Mg, K, Cu, Ca, Zn, Mn, P, I, амінакіслоты, пекцін, бялкі, клятчатка, глюкоза і іншыя рэчывы. За здольнасць садзейнічаць лячэнню розных захворванняў яго называюць «аранжавым доктарам». Пры рэгулярным ужыванні ён зніжае рызыку развіцця сардэчна-сасудзістых захворванняў, мае слабіцельны эфект, станоўча ўплывае на работу стрававальнай сістэмы, стымулюе дзейнасць нырак і печані, выводзіць з арганізма халестэрын і шлакі, спрыяе паляпшэнню зроку, павышае імунную рэакцыю арганізма, мае мачагонныя ўласцівасці і аказвае спрыяльны ўплыў на нервовую сістэму, — расказвае **памочнік урача-гігіеніста Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Таццяна ЛЯШКЕВІЧ.**

Мякаць гарбуза ўжываюць у сырым выглядзе, смажаць, тушаць, вараць, запякаюць... Пры жаданні можна знайсці велізарную колькасць разнастайных рэцэптаў. Насенне (гарбузікі) — не менш каштоўны складнік плода, чым мякаць. Гэта бадай найлепшая крыніца цынку, які надзвычай карысны для рэгенерацыі скуры і падтрымання мужчынскага здароўя. У ім утрымліваецца трыптафан — амінакіслата, якая прымае ўдзел у вытворчасці сератаніну — так званага гармона шчасця. Таксама гарбузікі здаўна славяцца супрацьгельмінтнымі ўласцівасцямі.

Але важна ведаць, што пры цукровым дыябеце, сур'ёзных парушэннях у рабоце страўнікава-кішачнага тракту і індывідуальнай непераноснасці гарбуз варта ўжываць з асцярожнасцю, а, магчыма, і зусім ад яго адмовіцца.



# ШАКАЛАДНЫЯ ЖАДАННІ ПА-БЕЛАРУСКУ




## Пірамідкі для дарослых і мяккі Бычок



Да Новага года фабрыка «Камунарка» рыхтуе больш за мільён падарункаў вагой ад 300 грам да трох кіло. Падарункавыя ласункі пакуюць у кардонную ці драўляную тару ў выглядзе конусаў, пірамідак, туб, а таксама ў яркія тэкстыльныя мяшочкі, да якіх прычэплены флікер. «Хаваюцца» цукеркі і ў сімвале надыходзячага года — Бычку — заплечніку ў выглядзе мяккай цацкі.

Многія арганізацыі ў дзіцячых падарунках адмаўляюцца ад цукерак, якія ўтрымліваюць алкаголь. Шмат просьбаў класці ў святочныя наборы карамелі. Але на фабрыцы прыдумалі «падарунак для дарослых» — з тымі самымі «алкагольнымі» і шакаладнымі цукеркамі.

Запушчаная летась на фабрыцы лінія па вырабе шакаладак з двухслаёвымі начынкамі павялічыла магутнасць фабрыкі на 5,5 тысячы тон прадукцыі. А прадукцыя з яе — шакалад па 100 і 200 грамаў, начынены ягаднымі пюрэ ці салёнай карамеллю, — сапраўды запатрабаваная.



З 2012 прадпрыемства істотна мадэрнізавалі, і выпуск прадукцыі павялічыўся ў 1,5 раза, а шакаладны экспарт вырас утрая (з чатырох тысяч тон у 2015-м да 12 тысяч сёлета). Найбуйнейшы пакупнік — Расія, куды адпраўляецца да 88 % ласункаў. Шмат айчыннага шакаладу трапляе ў Кітай і Украіну. Летась асвоілі рынкі Ірака і Вялікабрытаніі. У планах нალета — «захапіць шакаладам» Карэю. Усяго ж беларускія цукеркі цяпер экспартуюцца ў 26 краін свету.

## Ядомыя паштоўкі, карціны ды зоркі

Сярод упадабаных многімі класічных брэндаў салодкага гіганта — цукеркі, распрацаваныя яшчэ ў 40-х гадах мінулага стагоддзя. Сёлетні падарункавы набор «Беларусь сінявокая» ахвотна набываюць на замежныя прэзенты, гэтаксама, як і наборы «Слуцкія паясы» ды «Жадаю вам».



Штогод «Камунарка» запрашае да сябе на экскурсіі дзетак, каб тыя пабачылі, як гатуюцца салодкія дзівосы. Сёлета праз пандэмію ад прамысловага турызму прыйшлося адмовіцца. Аднак для журналістаў зрабілі выключэнне і правялі па некалькіх лініях. Перш чым трапіць у цэх, кожны супрацоўнік заўсёды праходзіў санапрацоўку, а цяпер і пагатоў. Намыліў рукі, змыў, выцер, апрацаваў растворам. Зялёны колер пропуску ў цэх аўтаматыка не запаліць, пакуль не пройдзеш усе неабходныя стадыі.

У салодкіх водарах фабрыкі можна згубіцца гэтак жа лёгка, як і сярод хітрых прыстасаванняў ды канвеераў, дзе замешваецца, узбіваецца, фармуецца, наразаецца, глазуруецца, абгортваецца смаката.

Нам давялося ўбачыць, як салодкая ружовая маса з цудоўным пахам ператвараецца ў малочны шакалад з клубнічнай нугой. Прасачыць шлях жэлейных цукерак з водарам вішні і паглядзець, як пакрываюцца шакаладам купалападобныя цукеркі. На іншай лініі «апраналася» ў шакалад «Птушынае малако». Як сярод гэтых аднолькавых белых кавалачкаў работнікі заўважаюць бракаваныя, застаецца невядомым. Для неспрактыкаванага вока ўсе цукеркі аднолькавыя.



Акрамя работ непасрэдна на лініях, дзе робяць цукеркі ды шакаладкі, мы трапілі ў сапраўдныя дызайнерскія студыі па прысмакаў. У адной паназіралі, як труфель «страчвае» сваю вострую верхавіну, каб «убрацца» ў шакаладны лісток ці міні-карцінку з павуцінкі шакаладу. У іншым кутку гэтага ж памяшкання — шакаладныя кубікі, трохвугольнікі і пірамідкі пакуюць у святочныя карабкі. А воддаль распісваюць узорамі шакаладкі, якія выглядаюць як міні-торцікі або зоркі.

Аднак самыя неверагодныя дзівосы робіць літаральна некалькі майстроў, якія распісваюць шакаладныя загатоўкі і робяць з іх ядомыя шэдэўры. Такое харáство і есці шкада, бо з-пад рук мастакоў выходзяць сапраўдныя святочныя паштоўкі з пажаданнямі і карціны, якія на першы погляд і не зразумела, з чаго зроблены.

Дарэчы, з 1 снежня «Камунарка» ладзіць своеасаблівы конкурс і запрашае наведвальнікаў фірменнай крамы дасылаць свае здымкі са спецыяльнай фотазоны, што арганізавалі супрацоўнікі прадпрыемства, якое сёлета адзначыла 115-гадовы юбілей.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# ЛЯСГАСЫ РЫХТУЮЦЦА ДА СВЯТ

## Першыя ёлачныя кірмашы запрацуюць ужо 19 снежня

**Старт передсвяточнаму гандлю дадуць лясгасы Брэсцкай і Віцебскай абласцей. З 20 і 21 снежня да іх далучацца лясгасы Гродзенскай вобласці, з 21 снежня — Мінскай вобласці, з 23 снежня — Гомельскай і Магілёўскай абласцей. Усяго будзе арганізавана звыш 1,1 тысячы гандлёвых пунктаў ад лясгасаў, дзе прадставяць прадукцыю па мінімальных цэнах.**

Як расказалі ў прэс-службе Міністэрства лясной гаспадаркі, работа ёлачных кірмашоў будзе арганізавана ва ўсіх абласных і раённых цэнтрах, на тэрыторыі лясніцтваў і лясгасаў. Як і ў мінулым годзе, з-за змянення правіл выдзялення гандлёвых плошчаў прадукцыя лясгасаў у сталіцы будзе прадстаўлена толькі ў двух пунктах: ад Мінскага лясгаса па вуліцы Баграціёна, 70 (запрацуе з 21 снежня), а таксама на ёлачных кірмашах па вуліцы Прытыцкага, 146, дзе прадукцыю будзе рэалізоўваць Рэспубліканскі лясны селекцыйна-насенняводчы цэнтр (запрацуе з 22 снежня). Разам з тым лясгасы Мінскай вобласці разгорнуць актыўны гандаль у населеных пунктах, якія цесна прымыкаюць да сталіцы: у Бараўлянах, Сенніцы, Валяр'янаве і іншых.

У асартыменце гандлёвых пунктаў традыцыйна будуць елкі, хвоі, а таксама навагодня букеты і дрэвы ў кадках. Што датычыцца апошніх, то іх будуць прадаваць ва ўсіх населеных пунктах з колькасцю насельніцтва ад 30 тысяч чалавек. У асартыменце — елка еўрапейская, елка сербская, елка калючая, піхта Нордмана. Кошт навагодняй дрэў будзе вар'іравацца ў залежнасці ад віду і памеру, а таксама ад рэгіёна, у якім ажыццяўляецца продаж, аднак яна будзе істотна ніжэй за кошт аналагічных дрэў, прапанаваных прыватнымі арганізацыямі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# Калядны кірмаш і рэзідэнцыя Дзеда Мароза

## У Магілёве зацверджана праграма навагодніх свят

**Яна вельмі вялікая і насычаная, вось толькі некаторыя яе мерапрыемствы. З 5 снежня свае гандлёвыя рады раскіне каля абласнога лячэбна-дыягнастычнага цэнтра навагодні кірмаш «Калядная крама».**

Старт асноўным навагоднім і калядным мерапрыемствам будзе дадзены на адкрыцці галоўнай гарадской ёлкі на плошчы Леніна 11 снежня. Праз тыдзень на базе дзіцячай бібліятэкі № 9 імя Янкі Купалы адкрыецца рэзідэнцыя Дзеда Мароза. Аматараў спартыўных забаў запросіць футбольны манеж па вуліцы Якубоўскага. Там адбудзецца грандыёзнае футбольна-казачнае шоу «Навагоднія прыгоды «Днепр STARS» у снежным каралеўстве». У праграме шмат канцэртаў, выставак, казачна-гульнявых праграм. У Магілёўскім гарадскім цэнтры культуры і вольнага часу пройдзе навагодні канцэрт «Ад сэрца да сэрца» Магілёўскай гарадской капэлы з удзелам людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Асабліва насычаныя будуць дні пачынаючы з 23 снежня. У гарадской выставачнай зале адкрыецца традыцыйная выстаўка-кірмаш вырабаў рамеснікаў і майстроў «Навагодні настрой», у парку Падніколле адбудуцца святы «Зімнія забавы» і «Хітрыкі цёткі Мяцеліцы», а самую загадкавую навагоднюю экскурсію правядзе «астраном» — загадчыца кафедры агульнай фізікі МДУ імя А. Куляшова Іна Івашкевіч. Сустрэча — а палове шостай 26 снежня на плошчы Зорак. Не прапусціце, будзе цікава.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении 17 декабря 2020 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 7»

| Предмет торгов |
|---|
| Бетоноукладчик в комплекте «Гомако» б/н, год выпуска – 1990, инвентарный номер 44034 |
| Местонахождение: Минская обл., Минский р-н, 500 м восточнее д. Богатырёво |
